ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год. выд. 33-і
№ 55 (1900)
10 ліпеня 1964 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Надзённае, неадкладнае

ЭКЗАМЕН НА ТВОРЧУЮ СТАЛАСЦЬ

Р. МАЧУЛІН,
намеснік міністра культуры БССР

Мастацтва Савецкай Беларусі вядома далёка за межамі рэспублікі. Лепшыя нашы творчыя калектывы неаднаразова выступалі ў сталіцы Радзімы — Маскве, нязменна завалёўваючы сэрцы слухачоў і гледачоў. Не менш славутае і беларускае народнае мастацтва, з глыбінь якога выйшла нямала прафесіянальных майстроў.

Сёння ў рэспубліцы працуе 21134 самадзейныя калектывы, у якіх удзельнічае больш 300 тысяч рабочых, калгаснікаў, служачых, вучнёўскай і студэнцкай моладзі.

Вялікім стымулам для творчага росту народных талентаў з'яўляюцца агляды мастацкай самадзейнасці, конкурсы, святы песні і танца, фестывалі, выстаўкі народнай творчасці і іншыя масавыя мерапрыемствы, якія сістэматычна праводзяцца ў рэспубліцы.

Раней розныя ведамствы наладжвалі гэтыя агляды і конкурсы самастойна. І, вядома, ведамасная адасобленасць перашкаджала пашырэнню вопыту лепшых мастацкіх калектываў і асобных выканаўцаў. Таму было вырашана праводзіць дэкады самадзейнага мастацтва рэспублікі, у якіх бы ўдзельнічалі калектывы і асобныя выканаўцы незалежна ад іх ведамаснай прыналежнасці.

Першая дэкада і агляды адбыліся ў 1958 годзе ў азнаменаванне 40-годдзя Савецкай Беларусі. У іх прынялі ўдзел 13 тысяч самадзейных калектываў. За час падрыхтоўкі да дэкады ў гурткі мастацкай самадзейнасці ўвайшло каля 20 тысяч новых удзельнікаў, было створана больш паўтары тысячы новых калектываў. Упершыню ў Беларусі нарадзіліся тады самадзейныя сімфанічныя аркестры.

Другая Дэкада народнага мастацтва, праведзеная ў 1962 годзе, прадэманстравала яшчэ больш высокі ўзровень выканаўчага майстэрства ўдзельнікаў самадзейнасці. Больш разнастайным, цікавым і актуальным стаў яе рэпертуар.

Цяпер шматтысячная армія ўдзельнікаў самадзейнасці рыхтуецца да трэцяй Дэкады народнага мастацтва, якая адбудзецца ў Мінску ў сакавіку 1965 года. Як і раней, ёй будуць папярэднічаць сельскія, раённыя, гарадскія і абласныя агляды народнай творчасці. У дэкадзе прымуць удзел лепшыя харавыя, танцавальныя, драматычныя і музычныя калектывы, асобныя выканаўцы мастацкай самадзейнасці прамысловых прадпрыемстваў, будоўляў, транспарту, калгасаў, саўгасаў.

Паказ дасягненняў народнага мастацтва будзе, як ніколі, шырокі і разнастайны. У сакавіку ў Мінску адкрыецца Рэспубліканская выстаўка народнай творчасці. Тут будуць паказаны творы самадзейных мастакоў, скульптараў, разбяроў па дрэву, вышывальшчыц і іншых народных умельцаў.

Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем Дэкады народнай творчасці Міністэрства культуры БССР і Белсаўпроф стварылі рэспубліканскі аргкамітэт, а таксама абласныя і Мінскі гарадскі аргкамітэты. Пачынаюць сваю работу раённыя і гарадскія аглядавыя камісіі. На прадпрыемствах, у калгасах, саўгасах, у навучальных установах ствараюцца аглядавыя камісіі, а ў абласных цэнтрах — каардынацыйныя камісіі, якія будуць займацца падрыхтоўкай справаздачных канцэртаў. Творчай ацэнкай выступленняў калектываў і асобных удзельнікаў дэкады народнай творчасці будуць займацца спецыяльныя журы.

Мы глыбока перакананы, што трэцяя Дэкада народнай творчасці яшчэ вышэй узніме ролю мастацкай самадзейнасці ў камуністычным выхаванні савецкіх людзей, прыцягне шырокія масы грамадскасці да работы палацаў і дамоў культуры, клубаў, чырвоных куткоў і бібліятэк.

Кожны агляд, кожная дэкада мае на мэце ўмацоўваць існуючыя і ствараць новыя самадзейныя калектывы, забяспечваць іх добрым рэпертуарам, які праўдзіва адлюстроўвае веліч і прыгажосць гераічных спраў будаўнікоў камуністычнага грамадства.

Трэба, каб у кожным сельскім, калгасным і саўгасным клубе, Доме культуры, на прадпрыемстве і ў навучальнай установе працавалі самадзейныя гурткі. Неабходна дамагчыся, каб раённыя, гарадскія і пасялковыя дамы культуры сталі сапраўднымі цэнтрамі метадычнай дапамогі сельскім, калгасным і саўгасным клубам, а таксама клубам устаноў і прадпрыемстваў. Гарадскія ўстановы культуры, незалежна ад іх ведамаснай прыналежнасці, павінны лічыць сваім абавязкам дапамогу сельскім работнікам культуры. Гэта паможа нам вырашыць яшчэ адну не менш важную задачу: павысіць выканаўчае майстэрства калектываў мастацкай самадзейнасці раённых, гарадскіх і сельскіх культасветустаноў.

У ходзе падрыхтоўкі да дэкады неабходна ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу культасветустаноў, адрамантаваць іх, добраўпарадкаваць, забяспечыць неабходным абсталяваннем, палівам, сцэнічнай вопраткай, музычнымі інструментамі, тэатральным рэквізітам.

Нам трэба дамагацца, каб больш аператыўна і па-дзелавому працавалі сёння нашы органы культуры, а таксама рэспубліканскі і абласныя дамы народнай творчасці. Іх абавязак — аказваць творчую і арганізацыйную дапамогу калектывам мастацкай самадзейнасці, аглядавым камісіям і аргкамітэту, прыцягваючы да гэтай справы работнікаў устаноў мастацтва і спецыялістаў.

Як і заўсёды, рыхтуючыся да дэкады і агляду, вялікія спадзяванні ўскладаем мы на творчыя саюзы рэспублікі — пісьменнікаў, кампазітараў і мастакоў, Беларускае тэатральнае аб'яднанне. Іх ганаровы абавязак — папоўніць рэпертуар мастацкай самадзейнасці рэспублікі новымі творамі, прысвечанымі Ул. І. Леніну, Камуністычнай партыі, Радзіме, жыццю і гераічнай працы савецкага чалавека, велічным здзяйсненням і перспектывам камуністычнага будаўніцтва, барацьбе за мір ва ўсім свеце, а таксама народнымі творамі і класікай.

Спадзяёмся, што выдавецтвы рэспублікі ў бліжэйшы час выдадуць новыя рэпертуарныя зборнікі для мастацкай самадзейнасці і метадычныя дапаможнікі па ўсіх відах і жанрах мастацтва, падрыхтаваныя Рэспубліканскім Домам народнай творчасці.

Час ідзе. Ужо сёння трэба, не прапускаючы ніводнага дня, па-дзелавому разгарнуць падрыхтоўку да трэцяй Дэкады самадзейнага мастацтва, каб ператварыць яе ў вялікае свята народнага мастацтва рэспублікі.

У ГЭТЫМ НУМАРЫ

РЫХТУЙЦЕСЯ ДА ДЭКАДЫ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ • СЛОВА СТАРЭЙШЫНЫ МАСТАКОЎ • НА ПАЧАТКУ ДАРОГІ • СПАКОЙНА СЕКТАНТАМ У ЖАЎТКАХ • ПРА НОВУЮ КНІГУ МАКСІМА ТАНКА • УРЫВАК З РАМАНА ІВАНА МЕЛЕЖА • ПЕРАД ФЕСТЫВАЛЕМ ПОЛЬСКІХ ФІЛЬМАЎ У МІНСКУ

НА РУБЯЖАХ СЯМІГОДКІ

Чорнае золата... Не многа ўжо засталося часу да той хвіліны, калі яно забулькоча па гэтых трубах, удыхне жыццё ў магутны арганізм завода-гіганта. Укладка нафтаноснай артэрыі зараз вядзецца ў наваколлі Наваполацка, на подступах да нафтаперапрацоўчага завода.

Фота Г. УСЛАМАВА (БЕЛТА).

ШКОЛЬНЫ МУЗЕЙ КУЗЬМЫ ЧОРНАГА

У цэнтры вёскі Цімкавічы Капыльскага раёна ўзвышаецца новы трохпавярховы будынак школы, якая носіць імя Кузьмы Чорнага — колішняга свайго вучня.

Цімкаўцы шчыра ўшаноўваюць памяць выдатнага пісьменніка — свайго земляка. Нядаўна побач са школай вырас невялікі зграбны домік. Вакол доміка — прыгожы кветнік, да ўваходу вядзе алея маладых каштанаў. Гэта — музей Кузьмы Чорнага, які пабудавалі і абсталявалі настаўнікі і вучні школы. Ініцыятар і арганізатар будаўніцтва музея — дырэктар школы, заслужаная настаўніца БССР З. Раманенка.

Экспанаты музея расказваюць аб жыцці і творчасці Кузьмы Чорнага. Тут фатаграфіі, шматлікія выданні кніг пісьменніка, малюнкі, зробленыя яго рукой, манаграфіі і крытычныя артыкулы, прысвечаныя творам пісьменніка.

Нядаўна адбылося афіцыйнае адкрыццё музея. На ўрачыстасць да цімкаўцаў прыехалі госці з Мінска, прадстаўнікі раённых арганізацый, сваякі К. Чорнага. Сярод калгаснікаў, якія прыйшлі ўшанаваць памяць земляка, было нямала старых людзей, якія асабіста ведалі яго ў гады маленства і юнацтва. Пасля цырымоніі адкрыцця музея і агляду экспанатаў прысутныя перайшлі ў актавую залу школы. Даследчык творчасці К. Чорнага пісьменнік С. Александровіч расказаў аб сваіх задумах і планах. Паэт А. Астрэйка прыгадаў акалічнасці сумеснай работы з К. Чорным у гады Вялікай Айчыннай вайны. Асабісты друг пісьменніка скульптар З. Азгур зазначыў, што ён добра знаёмы з жыхарамі Цімкавіч па творах і вусных апавяданнях К. Чорнага. Ён расказаў аб тым, як працаваў над партрэтам свайго сябра. Дарэчы, бюст Кузьмы Чорнага — падарунак З. Азгура — устаноўлены ў Цімкаўскай школе. Сваімі ўспамінамі падзяліўся аднакурснік К. Чорнага па Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі тав. Сянюк.

Пасля ўрачыстай часткі адбыўся канцэрт, у якім прынялі ўдзел самадзейныя спевакі, танцоры, музыканты — настаўнікі і вучні школы. Драматычны гурток паказаў аднаактовую п'есу К. Чорнага «Базылевічава сям'я».

Р. ПАРЫБАК.

Сяргей КАНЕНКАЎ:

ШЛЯХ ДА ТАЙНАЎ МАЙСТЭРСТВА



Сёння народнаму мастаку СССР, лаўрэату Ленінскай прэміі, правадзейнаму члену Акадэміі мастацтваў СССР Сяргею Каненкаву спаўняецца 90 гадоў. Работы скульптара добра вядомыя ў Савецкім Саюзе і за яго рубяжамі. Сяргей Каненкаў — чалавек, які валодае талентам вечнай маладосці. Кожны яго дзень — гэта руплівая праца, праца ў імя мастацтва, у імя людзей. Карэспандэнт АДН Яўгеній Лідзін папрасіў славутага скульптара падзяліцца сваімі думкамі аб прызначэнні і сэнсе выяўленчага мастацтва.

Уся каштоўнасць нашага жыцця — у працы. Цывілізацыя, якой цяпер так проста карыстаюцца людзі, — плён працяглай эвалюцыі, так сказаць, матэрыялізаваны вопыт многіх пакаленняў. Карыстаючыся электрычнасцю, тэлефонам, радыё і тэлебачаннем, самалётамі і аўтамабілямі, мы вельмі рэдка ўсведамляем велізарную каштоўнасць усіх гэтых вынаходніцтваў. А я яшчэ памятаю свет, у якім усяго гэтага не было, калі тэлефонная сувязь лічылася за цуд, а паравоз рабіў на вясковага жыхара ўражанне «вогненнага змея».

Я нарадзіўся ў 1874 годзе ў вёсцы Караковічы Ельнінскага павета Смаленскай губерні. Мне не было яшчэ пяці гадоў, калі я ўпершыню пацягнуўся да алоўка. Выразаў свае малюнкі, наклейваў іх на шыбу, каб іх было відаць і знадворку. Вароты і парканы размалёўваў вугалем.

У 1892 годзе я ўпершыню ўбачыў Маскву. Жадаючых паступіць у Вучылішча жывапісу, скульптуры і архітэктуры было многа, але я вытрымаў конкурсны экзамен. Жылося нялёгка, але затое я не ведаў, што такое дарэмна пражыты дзень, дзень, які не пакінуў следу. Я не замыкаўся ў коле абавязковых заняткаў — наведваў канцэрты кансерваторыі, слухаў Баха, Бетховена, Чайкоўскага, Невымерную магутнасць музыкі Паганіні ўспрымаў як шчасце жыцця, як шлях да дасканаласці і майстэрства.

Руская класічная літаратура была для мяне самай моцнай апорай. Яна ўводзіла мяне ў найбагацейшы духоўны свет, развівала адчуванне прыгожага і паэтычнага. Гогаль, Пушкін, Дастаеўскі вучылі мяне лепшы мастацкага вобраза.

Родным домам стала для мяне і Маскоўская гарадская мастацкая карцінная галерэя Паўла Міхайлавіча і Сяргея Міхайлавіча Трацяковых.

Мне ішоў сорак чацвёрты год, калі надышла Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя. Агонь свабоды заззяў над Расіяй, і радасць пранізала сэрца. Гэта было сапраўды другім нараджэннем, нараджэннем новай эпохі.

Памятаю многіх сваіх сяброў маладосці, па-сапраўднаму таленавітых людзей, якія ўмелі зразумець ідэю часу, знайсці новае ў тэндэнцыях мастацтва, але так і не здолелі ўзняцца на самую высокую ступень сапраўднага мастацтва. Як крыўдна, калі талент забіваецца пустазеллем, глухне, і ўся яго маладая сакавітая сіла траціцца марна!

Як жа гэта адбылося? Што з'явілася гэтаму прычынай? Тыя, пра каго я гавару, пагардліва ставіліся да працы. А самае ж гадоўнае ў мастацтве — гэта не той час, які траціцца на стварэнне партрэта ці скульптуры, не лёгкі поспех, а штодзённы, пакутліва цяжкі працэс, шлях да тайнаў свайго рамяства. Талент, не пацверджаны працаю, штодзённым удасканаленнем майстэрства, асуджаны на пагібель. Спачатку трэба навучыцца свабодна і лёгка абыходзіцца з матэрыялам, каб потым, не адчуваючы скаванасці, звязанай з тэхнічным бокам справы, працаваць па компасу натхнення.

Але той, хто спадзяецца на адно толькі натхненне, непазбежна прыйдзе да пустаты, якую ён не зможа пераадолець.

Я больш веру ў натхнёнае жыццё, чым у хвіліны натхнення. Схопленае на ляту, хоць і можа іншы раз стаць шэдэўрам, часцей за ўсё застаецца толькі эскізам, дзе мастак не здолеў ні зацвердзіць свой ідэал, ні выказаць сваё асабістае «я».

Я не стаў бы гаварыць усё гэта, калі б мае словы мелі дачыненне толькі да спадарожнікаў маёй маладосці, да тых, каму мае парады ўжо не могуць памагчы. Я звяртаюся да тых, хто творыць сёння, у тым ліку да нашай моладзі — мастакоў, якія валодаюць ужо некаторым вопытам або пазнаюць у мастацкіх навучальных установах азы сваёй будучай высокай прафесіі.

Эстэтычныя каштоўнасці вызначаюцца ўзроўнем развіцця эпохі. Яны пераглядаюцца кожным новым пакаленнем, і асобныя элементы іх перыядычна паўтараюцца. Так, некаторыя дэталі японскіх драўляных тэрас сталі канструктыўнай асновай сучаснай архітэктуры. Умоўнасці, якія праяўляюцца (там, дзе гэта да месца) у многіх галінах сучаснага мастацтва,— хіба не звязаны яны доўгім ланцугом часоў, вядомай традыцыяй з барэльефамі Асірыі, Вавілона і Егіпта — памятаеце, крылатыя быкі, цары ў стэрэатыпных позах?

Але ў кожным нацыянальным мастацтве ёсць і свае традыцыі. Мы, савецкія мастакі, можам смела і надзейна абаперціся на нашых вялікіх папярэднікаў ад Рублёва і Феафана Грэка да перадзвіжнікаў.

Той, хто спрабуе парваць з традыцыяй, рызыкуе фактычна парваць з самім мастацтвам. Так адбылося з плынню абстракцыянізму, фармальнай і бяздушнай копіяй геаметрычнага свету. Некаторыя апалагеты гэтага нашумелага «буму» ў мастацтве лічаць, што толькі абстракцыяніст выяўляе сапраўдныя канфлікты ўнутры самога індывідуума паміж сумленнем чалавека і грамадствам. Не ведаю, магчыма, абстракцыянізм і выяўляе з псіхалагічнай тонкасцю нейчы душэўны стан, але я падазраю, што гэта датычыць толькі псіхічнахворых.

На мой погляд, самае небяспечнае ў так званым мастацтве ліній — гэта яго адрыў, гвалтоўны выхад з рэчышча агульных традыцый. Сапраўднае мастацтва заўсёды пакідае за сабою права звяртацца да чалавека і гаварыць аб чалавеку. І які б ні быў фармальна моцны ілжэнаватар, калі ён выключае са свайго поля зроку чалавека і элементарныя законы мастацтва, ён непазбежна церпіць паражэнне.

Іншая справа — сапраўднае наватарства, новыя матывы ў мастацтве, якія выяўляюць сацыяльную напружанасць эпохі. Мастацтва Рэпіна было наватарскае і ў тым сэнсе, што ён з вялікай сілай адкрыцця паказаў нам страшэнную прыгнечанасць чалавека ў дарэвалюцыйнай Расіі, паказаў спакутаваных, няшчасных людзей, чый лёс — бясконцая і нудная нявольніцкая праца. Найталенавіцейшы жывапісец Урубель знайшоў новыя формы выяўлення: лініі ў яго творчасці адыгрываюць надзвычай важную ролю, але ён застаецца ў рамках рэальнасці, не пераходзіць межаў, якія аддзяляюць геніяльнае ад смешнага. Чуццё сапраўднага наватара падказвае яму, дзе спыніцца, а дзе смела ісці наперад, ломячы забабоны і прадузятасць старой школы. А гэтыя якасці забяспечваюцца не толькі талентам, але і выхаваннем, культурай, уменнем бачыць свет па-новаму.

Калі майстар застаецца глухі да важнейшых праблем жыцця грамадства, да ўраганнага шуму часу, больш таго — калі ён не бачыць, не можа ўгадаць будучыню, ён асуджаны на забыццё. Па цудоўным законе мастацтва вечна сучасным застаецца толькі тое, што было сучасна сваёй эпосе. Мы цэнім Рублёва не за рэлігійны сэнс яго работ, а за яго гуманізм, за тое, што ён у абліччы святога паказвае нам зусім рэальнага чалавека з яго душэўным светам.

Вельмі важна зразумець і выказаць сэнс эпохі. Памятаю, калі я быў гімназістам у горадзе Рослаўлі, адзін рэвалюцыйна настроены чалавек сказаў мне: «Намалюй ты студэнта, які прымае атруту, каб не выдаць таварышаў жандарам».

Гэта быў, калі можна так сказаць, першы сацыяльны заказ эпохі. Я пачынаў паступова разумець, што народ не прымае «чыстае» мастацтва, што яму патрэбна мастацтва баявое, рэвалюцыйнае, якое выказвае яго інтарэсы, спадзяванні, яго веру.

Акідваючы мысленным поглядам свой жыццёвы шлях ад часоў царавання Аляксандра III да нашых дзён, я магу сведчыць усім сваім вопытам, вопытам сваіх сяброў і ворагаў, што толькі сапраўднае народнае мастацтва, а не модныя сурагаты іншаземнага паходжання, прыносіць людзям сапраўдную карысць.

Для мяне пачатак работы ў мастацтве супаў з падзеямі вечнай гістарычнай важнасці. У Расіі ўзнімалася хваля рэвалюцыйнага руху. Мне было, пэўна, крыху больш за дваццаць, калі я, знаходзячыся ў сценах Маскоўскага вучылішча жывапісу, скульптуры і архітэктуры, адчуў непераадольнае жаданне стварыць вобраз народа, які вызваляецца. Так нарадзілася ідэя Самсона, біблейская сутнасць якой, зразумела, зусім згасла побач з яе класавым сэнсам. І цяпер, праз шэсць дзесяцігоддзяў, што аддзяляюць мяне ад тых дзён, я лічу «Самсона» сваёй карэннай работай — можа быць не ў сэнсе прафесіянальнага майстэрства, але ў сэнсе духоўнага значэння. Я назаўсёды захаваў у памяці словы Ілы Рэпіна, сказаныя пра майго «Самсона»:

— Якая сілішча! Якая магутнасць!

Пазней я даведаўся, што «Самсон» знішчаны. Я быў засмучаны і ўзрадаваны адначасова. Узрадаваны тым, што мая праца аказалася накіраваная дакладна ў цэль, што алегарычны сэнс «Самсона» быў ясны не толькі мне, яго стваральніку, але і тым, для каго я працаваў — людзям. Вось у гэтым чыноўнікі ад мастацтва і ўбачылі небяспеку. Тады я і зразумеў, якая вялікая сіла мастацтва, зараджанага рэвалюцыйнай ідэяй.

Рана ці позна даводзіцца падводзіць вынікі пражытага жыцця. Кожны з нас пакідае людзям пасля сябе маленькую спадчыну: машыну або верш, сад, пасаджаны на пустыры, ці сцяжынку, пратаптаную праз лясны гушчар. А мы, мастакі, пакідаем пасля сябе плён свайго натхнення, вынікі напружанай творчай працы. У стагоддзях захаваецца толькі тое, што стане дарагое людзям, у чым знойдуць яны сугучнасць сваім думкам і пачуццям.

Мы, нашчадкі Рублёва і Грэка, Іванова, Крамскога і Рэпіна, ніколі не адмовімся ад той вялікай запаведзі, якой заўсёды жыло наша нацыянальнае мастацтва: адлюстроўваць чалавека, перш за ўсё чалавека.

НАВІНЫ КУЛЬТУРЫ

КАНЦЭРТЫ СЯБРОЎ

У Гродна закончыліся гастролі Беластоцкага ансамбля песні і танца Польскай Народнай Рэспублікі. Мастацкі калектыў прабыў на Гродзеншчыне чатыры дні. За гэты час яго канцэрты наведала каля 20 тысяч гледачоў.

Польскія самадзейныя артысты выступалі перад працоўнымі Гродна. Пабывалі ў гасцях у рабочых і служачых Скідэльскага цукровага камбіната, працаўнікоў калгаса «Расія» Гродзенскага вытворчага ўпраўлення, сустракаліся з работнікамі культасветустаноў, самадзейнымі артыстамі вобласці. Усюды ўдзельнікаў ансамбля сустракалі як дарагіх сяброў.

БЕЛТА.

З ТВОРЧАЙ СПРАВАЗДАЧАЙ У МАСКВУ

Прыбыткаўскі народны хор Гомельскага раёна, які ўзначальвае заслужаны дзеяч культуры БССР Ф. Пятрэнка, адзначыў сваё трыццацігодзе. Гэтаму старэйшаму харавому калектыву аказан высокі гонар — ён выступае з творчай справаздачай на клубных сцэнах Масквы.

Да паездкі ў Маскву рыхтуецца і калектыў народнага ансамбля песні і танца Палаца культуры чыгуначнікаў імя Леніна. Ён выступіць на летняй эстрадзе ВДНГ і перад чыгуначнікамі Маскоўскага вузла.

З творчымі справаздачамі ў сталіцы нашай Радзімы выступяць таксама ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці Гомельскага Палаца культуры работнікаў мясцовай прамысловасці, агітбрыгада Жлобінскага гарадскога Дома культуры і Азершчынскі народны хор Рэчыцкага раёна.

БЕЛТА.

НОВЫ ЗЯЛЁНЫ ТЭАТР

Працоўныя горада Магілёва атрымалі падарунак— тут адкрыўся новы Зялёны тэатр. Ён размешчаны на тэрыторыі гарадскога парку культуры і адпачынку. Памяшканне яго прасторнае, глядзельная зала ўмяшчае каля тысячы чалавек, закулісная частка мае абсталяваныя грыміровачныя пакоі для артыстаў. Шырокая сцэна дазваляе размясціць на ёй вялікі музычны ці харэаграфічны калектыў.

У дні адкрыцця новага тэатра у парку Магілёва на яго сцэне выступілі Дзяржаўны народны аркестр БССР, Дзяржаўны сімфанічны аркестр, а таксама калектывы мастацкай самадзейнасці горада.

М. РУБІНШТЭЙН.

ДНІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў РСФСР

САРДЭЧНА, ШЧЫРА, ПА-БРАЦКУ

Як мы паведамлялі ўжо, у Сібір, у сувязі з днямі беларускай літаратуры ў РСФСР, выехала група беларускіх пісьменнікаў. Дні нашай літаратуры ў братняй рэспубліцы пачаліся ў сонечнай Туве. Наш карэспандэнт звязаўся па тэлефоне са сталіцай Тувінскай аўтаномнай рэспублікі горадам Кызылам. Да тэлефона падышоў старшыня Саюза пісьменнікаў Тувы Алег Саган-Аол. Ён расказаў:

— Працоўныя нашай рэспублікі, нашы літаратары сардэчна, шчыра, па-брацку сустрэлі дарагіх гасцей, прадстаўнікоў дзвюх братніх літаратур — беларускай і рускай. Мы з радасцю віталі на нашай зямлі Петруся Броўку, Максіма Танка, Рыгора Барадуліна, Янку Скрыгана, Міхася Калачынскага, Паўла Кавалёва, якія прадстаўляюць тут беларускую літаратуру, а таксама рускіх пісьменнікаў і паэтаў Льва Ашаніна, Паўла Ніліна, Алену Успенскую, Аляксандра Ісбаха, Аляксандра Някрасава, Якава Хелемскага. Свята трох нашых літаратур пачалося ўрачыстым сходам, наладжаным праўленнямі саюзаў пісьменнікаў РСФСР і Тувінскай АССР. Адкрыў сход першы сакратар абкома КПСС пісьменнік Салчак Тока. Ён сардэчна вітаў дарагіх гасцей на тувінскай зямлі. Горача сустрэлі прысутныя выступленне Петруся Броўкі, які шчыра падзякаваў за гасцінны і сардэчны прыём у Туве.

Нашы госці — беларускія і рускія літаратары — сустракаліся з рабочымі паратурбіннай электрастанцыі, студэнтамі Кызыльскага педагагічнага інстытута. 6-га ліпеня вечарам у Зялёным тэатры парку культуры і адпачынку горада Кызыла адбыўся вялікі агульнагарадскі літаратурны вечар, на якім прысутнічала больш дзвюх тысяч чалавек.

Свята літаратуры працягвалася і 7-га ліпеня. З самага ранку, падзяліўшыся на тры групы, госці і нашы літаратары выехалі ў сельскія раёны нашай рэспублікі, наведалі калгасы і саўгасы, дзе ў клубах і дамах культуры адбыліся шматлікія цёплыя сустрэчы з чытачамі.

А 8-га ліпеня кызылчане праводзілі гасцей у дарогу, за Саянскія хрыбты, у сяло Шушанскае. Там, у Краснаярскім краі, працягнецца свята вашай літаратуры.

Чатыры дні правялі мы з беларускімі сябрамі. Гэтыя дні надоўга застануцца ў нашай памяці. Мы і раней добра ведалі вашых цудоўных паэтаў і пісьменнікаў, чыталі і любілі іх кнігі. Ведалі і чыталі іх і нашы рабочыя, калгаснікі, студэнты, вучні нашай рэспублікі. А цяпер мы пазнаёміліся з лепшымі вашымі пісьменнікамі, з харошымі, шчырымі хлопцамі, паспелі пасябраваць з імі. Гэта паслужыць умацаванню нашай дружбы, пакладзе пачатак нашым непасрэдным літаратурным сувязям. І ў гэтым, мне здаецца, адзін з галоўнейшых вынікаў нашай сустрэчы і знаёмства з беларускімі літаратарамі.



Ул. КОНАШ. «Першы праект».

(З дыпломных работ выпускнікоў Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута).

ДОБРЫЯ І РОЗНЫЯ

29 чэрвеня ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце адзінаццаць маладых мастакоў абаранялі дыпломы. Гэта жывапісцы, графікі, мастакі тэатра. У іх карцінах, эстампах, эскізах дэкарацый мы ўбачылі творчыя пошукі, якія сведчаць аб цікаўнасці маладых мастакоў да з'яў нашай рэчаіснасці, аб іх уменні па-свойму адлюстроўваць сучаснасць, аб пільнай увазе да формы.

У параўнанні з папярэднімі выпускамі сёлетнія дыпламанты радуюць большай самастойнасцю. Зніклі тая «размашыстасць», той аднастайны «дэкаратывізм», што выдаваліся ледзь не за адзіную прыкмету сучаснай мовы выяўленчага мастацтва.

Усе чатыры жывапісныя работы прысвечаны нашай сучаснасці. Складаную жывапісную і кампазіцыйную задачу паставіў перад сабой Станіслаў Гарачаў у карціне «Студэнты-медыкі».

... Анатамічны кабінет. Студэнты рыхтуюцца да экзамену. Зімовы пейзаж за вялікім акном як бы сімвалізуе ўрачыстасць прыроды, падкрэсліваючы высакароднасць імкненняў будучых медыкаў. Паспяхова вырашана каларыстычная задача — пераважаюць белыя колеры з мноствам адценняў. Праз прыватны жыццёвы факт малады мастак імкнуўся адлюстраваць тыповае, характэрнае для нашай моладзі. Жывапісны лад карціны, кампазицыю, рытм, вобразы аўтар у прыкметнай ступені здолеў падпарадкаваць тэме адказнасці моладзі за сваю будучую прафесію. У тым, што тэма вырашана проста, без прэтэнзій на знешні эфект,—прыкмета ўдумлівасці дыпламанта ў падыходзе да творчай задачы.

У карціне Уладзіміра Конаша «Першы праект», на маю думку, менш абагульнення. Але і тут досыць пераканаўча перададзены рысы нашай моладзі, якая прымае актыўны ўдзел у будаўніцтве камунізма. Мастак расказвае пра дружны студэнцкі калектыў, дзе ўсе перажываюць поспехі і няўдачы кожнага з сяброў. Шматфігурнасць кампазіцыі паставіла перад аўтарам складаныя задачы. Выканаў ён іх досыць паспяхова. Адчуваецца дэталёвая штудзіроўка натуры, настойлівасць у вырашэнні колернай задачы.

У простым будзённым факце вяртання сельскіх вучняў са школы ўбачыў малады мастак Яўген Красоўскі нешта значнае, паэтычнае. Група дзяцей ідзе па раллі. Гэтыя дзеці— быццам тая рунь на полі. У карціне няма паказных эфектаў. Кампазіцыя вырашана лаканічна. Роўнае святло. Трывалая колерная гама. Адчуваецца, аднак, «разнабой» у жывапісных прыёмах.

Нескладаны сюжэт і ў карціне Георгія Краўчука «Над Нёманам». Даяркі чакаюць статак. Над Нёманам апускаецца вечар. Лірычны настрой людзей, у прыродзе, паэзія сельскага быту і працы прываблівае гледача, нягледзячы на тое, што ва ўсім удалося аўтару ўвязаць між сабой у чыста жывапісных адносінах першы і дальні планы.

У кожнай з названых карцін адчуваецца ў той ці іншай ступені недастатковы вопыт аўтараў. Але важна тое, што выпускнікі, якія працавалі пад кіраўніцтвам народнага мастака БССР, прафесара І. Ахрэмчыка, выявілі сур'ёзныя адносіны да жывапісу, да персанажаў, да пабудовы кампазіцыі.

Маладыя тэатральныя мастакі — вучні заслужанага дзеяча мастацтва БССР, дацэнта П. Масленікава — падышлі да абароны дыпломаў з пэўным практычным вопытам афармлення спектакляў у тэатрах рэспублікі. Дыпломы яны абаранялі эскізамі дэкарацый да класічных п'ес: Мікалай Апіёк—да оперы Д. Вердзі «Атэла», Ляонцій Арапаў — да оперы М. Мусаргскага «Барыс Гадуноў», Барыс Казакоў — да драмы Шэкспіра «Антоній і Клеапатра». Эскізы сведчаць аб імкненні іх аўтараў мысліць вобразна, уважліва вывучаць эпоху, герояў твораў, пранікаць у складанасць сцэнічнай пабудовы спектакля. Выклікае пэўныя пярэчанні толькі аднастайнасць матэрыялу ў эскізах (масла).

Паспяхова абаранілі дыпломы і чацвёра выпускнікоў-графікаў майстэрні дацэнта П. Любамудрава.

Наталля Паплаўская аформіла раман Івана Мележа «Навальніца над полем» у тэхніцы лінагравюры. Спецыфічнаю моваю графікі мастачка здолела дапоўніць і раскрыць вобразы твора, драматызм сутыкнення двух светаў—старога і новага, тыя вялікія змены, якія адбыліся на беларускім Палессі пасля Кастрычніка. Імкненнем да філасофскага абагульнення вызначаюцца, напрыклад, лісты «Агледзіны», «На магіле дзіцяці». У кампазіцыях Н. Паплаўскай фон, штрых, рытмічны лад падпарадкаваны выяўленню псіхалагічнага стану персанажаў.

Уладзімір Філіпенка доўга вывучаў працу і побыт рачнікоў Беларусі. Яго серыя каляровых лінагравюр «Агні на рацэ» вызначаецца лірызмам, трапнай перадачай рыс сённяшняга беларускага пейзажу.

У тэхніцы літаграфіі выкананы ілюстрацыі да апавяданняў Зм. Бядулі дыпламантам Пятром Драчовым. Бядулеўскае ўмельства на прыватным факце пабудаваць сацыяльнае абагульненне (напрыклад, «Пяць лыжак зацірки») адчута ілюстратарам. Паклаўшы ў аснову стыль народнага лубка, малады мастак тактоўна спалучае ў сваіх ілюстрацыях сур'ёзнасць і гумар у залежнасці ад зместу таго ці іншага апавядання.

«Ніжнетагільскі металургічны камбінат» — так называецца серыя літаграфій Уладзіміра Самачарнова. Індустрыяльная магутнасць Урала, рытм працы на сучасным прамысловым прадпрыемстве, характары перадавікоў працы — пра гэта мастак расказвае ўсхвалявана, задушэўна.

Добрых і розных мастакоў выпусціў сёлета наш інстытут.

Ф. ВАЛАДЗЬКО.

Я. КРАСОЎСКІ. «Рунь».
(З дыпломных работ выпускнікоў Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута).

А ПОБАЧ— МАЛІТОЎНЫ ДОМ

Пётр ХАРКОЎ.

ВЁСКА Жаўткі невялікая і ціхая. Ад яе да раённага цэнтра Вілейкі каля васьмі кіламетраў.

Але не толькі «поле чыстае» акружае гэтую вёску. За які-небудзь кіламетр ад яе знаходзіцца торфапрадпрыемства, а крыху далей — вёска Цынцэвічы.

Некаторыя жаўткоўцы ўжо не першы год на торфапрадпрыемстве, некаторыя ў брыгадзе саўгаса «Любань», цэнтрам якой з'яўляецца Цынцэвічы. У Цынцэвічах — школа - васьмігодка, клуб, магазін, а на торфапрадпрыемстве—чырвоны куток.

А што ж у саміх Жаўтках?

А ў Жаўтках — некалькі дзесяткаў звычайных хат і... малітоўны дом сектантаў, даволі ўтульнае гняздо «евангельскіх хрысціян-баптыстаў».

Некаторыя з мясцовых раённых актывістаў сцвярджаюць, што жаўткоўская абшчына дажывае апошнія дні, што там стараюцца ва ўслужэнні госпаду богу пераважна старыя людзі і, нібыта, зусім няма «прыбліжаных» (гаворка ідзе пра кандыдатаў у абшчыну, якія яшчэ не сталі яе членамі).

Яшчэ таварышы з раёна падкрэсліваюць, што абшчына ў Жаўтках паявілася не ўчора і не пазаўчора, што існуе яна з часоў панскай Польшчы. Маўляў, не пад нашым крылом нарадзілася, а вось сёння, глядзіце, пад нашым уплывам зводзіцца на нішто.

Гэта праўда — не толькі ў Жаўтках, але і ўвогуле ў большасці вёсак заходніх раёнаў Беларусі сектанцтва перададзена нам у спадчыну ад старапольскіх часоў. Праўда і тое, што сфера ўплыву сектантаў паменшала. Але колькі гадоў мінула са старапольскага часу, а абшчына існуе і дзейнічае! Гэта ўжо мала падобна на «згасанне», а хутчэй, бадай, на жывучасць...

У Вілейцы ёсць нямала людзей, якіх гэты факт хвалюе, непакоіць. Вось, скажам, лектар Вілейскага партыйнага камітэта тав. Лукша— з ім я сустракаўся яшчэ ў першы свой прыезд у гэтыя мясціны. Ён усхвалявана гартаў свае запісы, называў прозвішчы, імёны, даты, расказваў пра людзей і сустрэчы з імі. Мне не спадабалася толькі, што лектар занадта часта спасылаўся на «абмежаванасць магчымасцей і ўмоў», якія мае вёска, на цяжкасці ў рабоце атэістаў. Чаму ж вы, таварышы, год за годам працуючы ў рамках гэтых «абмежаваных магчымасцей», амаль нічога не робіце, каб іх пашырыць?

Прыязджалі неяк у Вілейку лектары з інстытутаў Акадэміі навук БССР. Быў сярод іх спецыяліст па хіміі, былі лектары па кібернетыцы і па сельскай гаспадарцы. Адзін з іх прачытаў аж тры лекцыі аб «праблемах атэізму», у тым ліку і пра сутнасць рэлігійных дагматаў, што прапаведуюцца баптыстамі. Але пабывалі гэтыя таварышы ўсюды, толькі не ў Жаўтках. Чаму ж не ў Жаўтках, дзе так патрэбна жывое слова атэіста?

— Ды ў вёсцы гэтай і людзей сабраць няма дзе, не ў малітоўны ж дом ламацца з лекцыяй, — гавораць у Вілейцы.

Не верыцца, таварышы. Вы самі расказвалі, з якой цікавасцю слухалі летась жаўткоўцы прыезджага лектара тав. Лапцева. Ён правёў гутарку аб ідэалагічнай дыверсіі імперыялізму, раскрыўшы адначасова рэакцыйную сутнасць сектанцтва. Тады знайшлося дзе сабраць людзей! І прыйшло іх шмат.

Яшчэ раней тут жа, у Жаўтках, адбыўся цікавы вечар, у якім прынялі ўдзел дырэктар адной з вілейскіх школ, ветэрынарны ўрач, педагог-фізік і лектар парткома. Многае было на гэтым вечары: і лекцыя аб паходжанні чалавека, і працяглая спрэчка аб сектантах, у якой ветэрынар А. Лапеха начыста «паклаў на лапаткі» мясцовых баптысцкіх тэарэтыкаў, і ілюстраваны найпрасцейшымі доследамі расказ выкладчыка фізікі П. Міхайлава пра незвычайныя з'явы ў атмасферы... Але галоўнае было не ў гэтым. Мнагалюдны вечар быў праведзены ў хаце роднага брата тагачаснага прэсвітэра баптысцкай абшчыны, вядома, са згоды гаспадара. Вось і ў такім месцы можна, аказваецца, «сабраць людзей»!

Атэісты, удзельнікі вечара, з прыемнасцю ўспамінаюць, як доўга яшчэ пасля гаварылі аб ім Жаўткі.

Значыць, праблему «ўмоў і магчымасцей» разумець і тлумачыць можна па-рознаму. Прычым, шмат што можна зрабіць нават пры адсутнасці клуба.

Дарэчы, пра клуб. Вядома, гэта не проста і не лёгка—адразу пабудаваць у невялікай вёсцы клуб. Але ж у Жаўтках на адсутнасць клуба наракаюць ужо шмат гадоў. Думаецца, што пакрысе гэтую праблему можна было б ужо вырашыць.

Мне прыходзіць на памяць цікавая гутарка з Уладзімірам Пятровічам Клешняком, загадчыкам ідэалагічнага аддзела Вілейскага партыйнага камітэта. Ён расказаў, як у іншай вёсцы гэтага ж раёна вырашалася праблема клуба. За будаўніцтва яго дружна прагаласавала ўся вёска, і толькі адзін з сектантаў (там яны таксама водзяцца), застаўшыся з вока на вока з госцем, папракнуў тав. Клешняка за тое, што нібыта ён, кіруючы таварыш, падтрымаў непрадуманае рашэнне сходу: у першую чаргу, «напомніў» сектант, трэба вырашаць пытанні гаспадарчыя, а менавіта — «адраманціраваць стайню, з клубам жа можна і пачакаць...»

— Заўважаеце, куды гне? — гаварыў Уладзімір Пятровіч. — Якая там стайня—майму субяседніку, сектанцкаму «пастару», вядома, было ўсё роўна. Проста ён клуба баяўся, як агню...

Але хоць у Жаўтках пакуль няма клуба, ён ёсць у Цынцэвічах. А торфапрадпрыемства мае прасторны чырвоны куток. Што ж робяць суседзі, каб памагчы ў культурным, грамадскім жыцці маленькай вёсцы? Ды ў тым і бяда, што амаль нічога. Ні жаўткоўцаў да сябе не клічуць, ні самі да іх не едуць: чаго ісці туды? Сам жа Цынцэвіцкі клуб, як і чырвоны куток на торфапрадпрыемстве, выкарыстоўваецца толькі для агульных сходаў ды паказу кіно.

У канторы прадпрыемства мне давялося прачытаць нумар насценнай газеты «Тарфянік». Нямала радаснага для рабочых, для дырэкцыі было ў яе радках. Партыйны камітэт, напрыклад, віншаваў калектыў з паспяховым выкананнем вытворчага плана і жадаў тарфянікам новых поспехаў. Як хацелася напісаць побач з тымі добрымі пажаданнямі такія вось словы: «А побач жа з вамі — малітоўны дом!», каб над гэтым задумаліся на прадпрыемстве.

Я не думаю, што перабольшваю ролю царквы, сектанцтва, як з'явы ў сённяшнім нашым жыцці — у аснове сваёй яны для нас ужо ў мінулым. Аднак клешч сектанцкай заразы сям-там яшчэ вельмі і вельмі жывучы. Міжволі думаеш пра гэта, назіраючы бесклапотную баптысцкую «благодать» у вёсцы Жаўткі і вакол яе. Спакой, якім акружана абшчына сектантаў у Жаўтках, выклікае трывогу.

Сёй-той з нас прывык абурацца цемрашальствам царкоўнікаў і сектантаў толькі пры паведамленні аб нечай трагедыі, аб нечым загубленым жыцці. У Жаўтках у гэтым сэнсе быццам нічога страшнага пакуль не здарылася. Але ці можна спакойна назіраць за тым, як побач з табою жывуць людзі, з галавы да ног аблытаныя павуціннем забабонаў і цемрашальства?

МУЗЕЙ У ДУКОРАХ

У 20-ю гадавіну вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у сяле Дукоры адбылося адкрыццё краязнаўчага музея. У ім сабраны дакументы аб старажытнай гісторыі краю, аб партызанскім руху.

Вялікае месца ў музеі займае карцінная галерэя, якую склалі работы беларускіх мастакоў. Звыш ста сваіх твораў падпеслі ў дар сельскаму музею вядомыя беларускія мастакі О. П. Марыкс, Ю. В. Пучынскі, В. М. Ткачук, І. Т. Ціханаў, М. Х. Даўгяла, С. П. Каткоў, С. П. Герус, Л. С. Ран, Н. В. Дучыц, А. В. Волкаў і іншыя.

Шэсцьдзесят работ належаць Г. Ф. Бржазоўскаму, які бясплатна перадаў іх музею. Асаблівая памяць звязвае мастака з Дукорамі. Тут, у дукорскай пушчы, ваяваў ён у гады вайны ў партызанскім атрадзе імя Калініна. Тут наглядаў ён жыццё людзей у пасляваенны час, пісаў партрэты герояў працы, свае найбольш значныя творы.

У карцінай галерэі шырока прадстаўлен жывапіс, графіка.

Творы прысвечаны барацьбе беларускага народа з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і сённяшняму жыццю нашага краю.

Мастакі Мінска бяруць над сельскім музеем шэфства. Калекцыя карцінай галерэі будзе папаўняцца.

БЕЛТА.

ПРА ІНІЦЫЯТЫВУ, ЯКАЯ ЗГАСЛА

Маладому рабочаму Бабруйскага вагавага завода Мікалаю Царову аднаму з першых у горадзе прысвоілі ганаровае званне ўдарніка камуністычнай працы. Працуе Мікалай вельмі старанна і адначасова вучыцца завочна ў тэхнікуме. Ён прымае актыўны ўдзел у рабоце камсамольскага пражэктара і ў народнай дружыне. На заводзе яго ведаюць вясёлым, жыццярадасным юнаком.

Неяк нядаўна сустрэў я Мікалая а дзевятай гадзіне вечара. Даўно закончыўся яго працоўны дзень, зрабіў ён, што трэба было і дома, а далей чым заняцца? Не будзеш жа ўвесь вольны час сядзець за кнігай. І юнак пайшоў у гарадскі парк, спадзеючыся, што там ён весела адпачне. Пакатаўся на арэлях, пагуляў раз-другі па алеях парку, нічога цікавага не напаткаў і сеў, сумуючы, на лаўку.

— Можна на танцавальную пляцоўку завітаць, — параіў я.

— Не кожны ж дзень танцаваць, — адказаў юнак.

І Мікалай нагадаў, што нядаўна ён быў у Маскве ў адным з паркаў. Спадабалася юнаку, як там клапоцяцца пра адпачынак людзей, як умела яго арганізуюць. Завадатарамі цікавых спраў у той вечар былі масавікі, але не прафесіяналы, а ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці. Яны арганізоўвалі цікавыя гульні, было вельмі весела, і вечар прайшоў непрыкметна.

— А хіба ў Бабруйску нельга тое ж самае зрабіць? — пытаецца Мікалай.

Вядома, можна. Я магу назваць нямала актыўных удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, якія ахвотна згадзіліся б, скажам, раз у тыдзень паказаць свае здольнасці ў новай для іх ролі масавікоў-забаўляльнікаў. Гэта — настаўнік 4-й сярэдняй школы Р. Цітоў, работніца фабрыкі мастацкіх вырабаў А. Перліна, рабочы швейнай фабрыкі Авечкін і многія іншыя. У сваіх калектывах іх ведаюць добрымі канферансье. На самадзейных балях яны паказалі спрыт і ўмельства. Дык чаму ж не запрасіць іх у гарадскі парк. Няхай бы адзін вечар яны павесялілі адпачываючых, а ў наступны раз іх змянілі б аматары-масавікі з іншых прадпрыемстваў і ўстаноў Бабруйска.

Пакуль што дырэкцыя парку не шукае сабе памочнікаў—арганізатараў адпачынку працоўных, хоць патрэба ў гэтым відавочная. Парк сёлета лепш чым у мінулыя гады добраўпарадкаваны. Але гэта толькі пачатак справы. Галоўнае ж цяпер дбаць, каб у цудоўным зялёным кутку горада моладзь не бадзялася, не пакутавала ад сумоты.

А як адпачываюць жыхары, што жывуць на ўскраінах горада? Ёсць у Бабруйску раён, дзе сканцэнтраваны буйнейшыя фабрыкі і заводы горада: фанера-дрэваапрацоўчы камбінат, завод гумава-тэхнічных вырабаў і іншыя прадпрыемствы. Тут многа людзей, а клуб адзін. У ім штодзень дэманструюцца фільмы, якія рабочыя паспелі паглядзець у кінатэатрах горада. Праўда, зрэдку наладжваюцца вечары адпачынку, канцэрты. Але гэта ў памяшканні, хоць побач з клубам ёсць добры сквер, і можна было б арганізоўваць адпачынак моладзі на вольным паветры.

І ў іншых клубах горада пра летнія формы адпачынку ніхто не клапоціцца.

Многія бабруйчане памятаюць, як гады тры—чатыры назад у парку і скверах горада ў нядзелю іграді аркестры, выступалі самадзейныя артысты, калектыўна развучваліся новыя песні. На жаль, добрая ініцыятыва хутка згасла.

Летась гарком камсамола вырашыў стварыць сем летніх эстрадных пляцовак у скверах горада. Згодна з гэтым планам арганізатарамі адпачынку працоўных павінны быць буйнейшыя самадзейныя калектывы горада.

Так, напрыклад, швейніцы фабрыкі імя Дзяржынскага наладжваюць вечары адпачынку ў скверы імя Чалюскінцаў, самадзейныя артысты клуба мясцовай прамысловасці — у скверы імя Бахарава і г. д.

Добрае рашэнне, але яно засталося на паперы.

Задума не была ажыццёўлена таму, што не пабудавалі ў скверах эстрадных пляцовак, ніхто не арганізаваў суботнікаў, каб добраўпарадкаваць і абсталяваць гэтыя пляцоўкі. Не было каму прыйсці ў калектывы, каб пагаварыць з самадзейнымі артыстамі, растлумачыць ім, чаму так важна іх дапамога.

У горадзе звыш шасці тысяч удзельнікаў мастацкай самадзейнасці. Трэба іх толькі зацікавіць, тады здольная моладзь будзе першым завадатарам і арганізатарам летняга адпачынку працоўных. Сёння ж многія самадзейныя артысты скардзяцца, што летам яны чамусьці выступаюць вельмі рэдка.

Недаравальна, што такі багаты творчы рэзерв у арганізацыі летняга адпачынку працоўных не выкарыстоўваецца. Гарадскі аддзел культуры, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі горада дрэнна клапоцяцца, каб летам бабруйчане адпачывалі культурна і весела.

М. БЯРЭЗІНСКІ.

400-ГОДДЗЕ БАРКАЛАБАВА

Становіцца добрай традыцыяй адзначаць гадавіну сваіх родных месц, няхай гэта будзе нават не горад, а невялікая вёска. Прыкладам можа служыць сяло Баркалабава Быхаўскага раёна, працоўныя якога днямі адзначалі 400-годдзе з дня заснавання.

Па матэрыялах летапісца вёска была заснавана ў 1564 годзе Баркулабам Іванавічам Корсакам. Першыя ўласнікі вёскі (Корсак, Саламярэцкі, Статкевіч) былі заўзятыя праціўнікі каталіцызму і ўніі. Яны былі заступнікамі праваслаўных братэрстваў у Магілёве, Вільні, Мінску і Кіеве. Імі былі заснаваны ў Магілёве — Буйніцкі, у Оршы — Куцеінскі мужчынскія манастыры, у Баркалабаве — жаночы манастыр. Пры Куцеінскім манастыры была друкарня. Баркалабава становіцца адным з цэнтраў барацьбы з каталіцызмам, сюды прыцягваліся відныя прадстаўнікі беларускай культуры. Тут працаваў вядомы беларускі кнігадрукар Лаўрэнцій Зізаній, аўтар «Граматыкі славенскай». Ён навучаў «па руску грамаце і па грэцку».

У Баркалабаўскім манастыры была вялікая для таго часу бібліятэка. У ёй захоўваліся старажытныя рукапісы і кнігі на рускай, беларускай, польскай, старославянскай і іншых мовах — першыя выданні друкарань Масквы, Кіева, Вільні і беларускай друкарні. Кнігі былі не толькі паркоўныя, але і свецкага зместу.

Ю. СМАЛЬЯНАЎ.

ДАРОГІ І ЛЮДЗІ

З ДРУГОЙ ЧАСТКІ РАМАНА «НАВАЛЬНІЦА НАД ПОЛЕМ»

Ледзь не ўвесь час Апейка жыў цяпер папаходнаму. Ледзь не кожны дзень —па сельсаветах, па вёсках, па дарогах.

Дарог большых было тры. Адна, самая кароткая і самая добрая, адразу ля дома райвыканкома глінянымі каліянамі крута лезла ярам угару. Тут Апейка заўсёды ішоў побач з таратайкай, іншы раз памагаючы коням. На гары было некалькі, найбольш новых, месцачковых хат, сярод якіх высілася старая цагляная царква, пра якую некалі Апейка з гонарам і здзіўленнем вычытаў некалькі слоў у «Расіі» Сямёнава-Цянь-Шанскага. Царква стаяла не беленая, абадраная, яе даўно ўжо меркавалі закрыць, але здалёк, асабліва сонечнымі днямі, здавалася дзіўна белаю і вясёлаю. Адсюль, з гары, шырока і далёка была відна зямля: Апейка з ахвотаю глядзеў,

2

як ішлі і ішлі палі, дзе-нідзе перарэзаныя дарогамі, расквечаныя купкамі дрэваў; за сінаватай смугою хораша, мякка плылі таполі, рыскі далёкіх садоў ды стрэх, абрысы ўзлесяў. Дарога была шырокая і роўная — стары шлях з шумлівымі бярозамі і тэлефоннымі слупамі: коні тут не толькі ішлі, а і беглі ахвотна, колы лёгка каціліся ў цвёрдых каляінах,—дарога паволі ўсё паніжалася і паніжалася, пакуль не ўпіралася ў нешырокае балота абапал рачулкі Тур'і, дзе раптам збочвала і ўжо бралася мастком ды крывою падковай грэблі.

Адсюль балоты ўжо амаль не адпускалі шлях: ішлі ўвесь час поблізу, край іх добра абазначалі стрэхі гумнаў і сады, — сёлы тут ляпіліся к самым балотам, так што платы агародаў гнілі ў балоце. Ды і самі вуліцы, асабліва ў веснавое разводдзе ці асеннюю слату, падобна было, танулі ў балоце: людзі тут адвеку шкадавалі кожны шматочак добрай зямлі. Час ад часу балоты нецярпліва падбіраліся да самага шляху, а то і перахоплівалі яго: ад Тур'і, ад Глінішчаў кожныя паўтара-два кіламетры шлях узыходзіў на чорныя грэблі, тэлефонныя слупы ішлі цераз твань. Пад самы шлях падыходзіла балота і на мяжы раёна...

Раён цягнуўся ўздоўж Прыпяці: на карце ў Апейкавым кабінеце, якую намаляваў Апейку ў школе, раён падобны быў на рыбіну, што ляжала ўсцяж ракі. Мяжа нібы знарок старалася не адыходзіць далёка ад берагу, віляла найбольш амаль згодна яму. Усцяж берагу з мястэчка ў процілеглыя бакі і ішлі дзве другія большыя дарогі. Абедзве яны ішлі па нізу, адна, прагрукатаўшы брукам галоўнай раённай вуліцы, адразу за апошнімі дамамі ўлазіла ў густы і цёмны сасновы лес. Ён, абхапіўшы, сціснуўшы дарогу з двух бакоў, не выпускаў яе больш за два дзесяткі кіламетраў, да самай чыгуначнай станцыі, якую таксама абцінаў лес. І гадзіну, і другую, едучы тут, бачыў Апейка нейкі насцярожаны лес, чуў, як важка ідуць у глыбокім пяску колы, як натужваюцца коні. Адсюль, калі збочваў улева, лесам, пяскамі, цераз брады Апейка выбіраўся да прырачных вёсак, да Прыпяці: управа ж дарога выводзіла яго ў новыя лясы, у балоты, сярод якіх радкі хат з саламянымі ды гонтавымі стрэхамі, агароды ды палі былі, як астравы ў зялёным моры...

Самая знаёмая была Апейку тая дарога, што бегла з мястэчка ўніз па Прыпяці. Тут было ўсё асабліва вядомае: кожны ручайчык, кожная лугавіна, кожны радок крывых, кара-

3

вых верб пры дарозе. Ад таго, што бачыў іх часта, а найбольш, мабыць, таму, што апаноўваў які-небудзь клопат, зазвычай нецярплівы, неспакойны, вочы нярэдка быццам і не бачылі ні верб тых, ні лугавін. Быццам не было ў іх нічога асаблівага. Але здаралася і такое — найчасцей ціхімі залатымі днямі, калі сэрца раптам станавілася немаведама чаму на дзіва кволым, чулым — што і вербы і грэблі ішлі ўжо насустрач, знікалі як жывыя, як блізкія. Радасць, нейкая святочнасць, чібы павуціна, квола трымцелі ў сярэдзіне, калі згадваў, як ехаў паўз гэтыя самыя вербы цікаўным, палахлівым звярочкам — першы раз у вялікі свет, у Юравічы, калі згадваў дробныя драбніцы, што зачаравалі, урэзаліся ў памяць на ўсё жыццё. Тужліва было, калі ўспомнілася, як гэтай вось грэбляю п'янага, ачмурэлага везлі на вайну, як гарланіў з братам Саўлюком «паследні нынешні дзяцінчак», як бацька адварочваўся, жалліва шморгаў носам. Тут—ціхі, пастарэлы, здавалася, на сто гадоў, ехаў цераз паўтара гады ранены — асцярожна трымаў на сене забінтаваную нагу. Побачыў сене ехалі мірна мыліцы, пабліскваліі дзвюма чорнымі цыратавымі падушачкамі. Каля хаты ён знарок весела скокнуў з гэтымі мыліцамі, а матка — раптам уголас, на ўсё сяло... Увесь дзень то смех, то — слёзы...

Другі раз везлі раненага ўжо з белапольскага фронту. Ногі цяпер хадзілі добра, але куля прашыла верх лёгкага і лапатку, — рука вісела як чужая. Дактары раілі малако, чыстае паветра і адпачынак... Чыстага паветра хапала ўдосталь, а малака не было: адзіную кароўку зжэрлі прагавітаю гайнёю паны ўланы. Не было і як адпачываць: дзе ты будзеш сядзець зломкам, калі ўсе ў полі, па лузе, у клопаце. Левая рука пачынала жыць быццам нанава: вучылася рабіць за правую...

А потым, з шынелем, у нехалодныя дні накінутым напашкі, ездзіў сам па сельсавецкай каняцы ў воласць, спярша — сакратар, а потым — старшыня сельсавета. Усё быццам сышлося к таму, каб кіраваць сельсаветам: і такая-сякая грамата, прывезеная з армейскай службы, і ранняя сталасць, набытая раненнямі ды вандраваннямі ваеннай пары, і нават калецтва. І праца была важная, патрэбная, і не толькі важная, а і небяспечная. Дасюль, калі ехаў тым балотам, дзе чорны зараснік лез з абодвух бакоў на грэбельку, чуў, як халадзее ў сярэдзіне: трэба ж, ледзь не аддаў душу за нішто! От тут, вылезла пачвара гэта —бандзюга — гаркнула: «А ну, злазь!..» Ён

4

ад неспадзеўкі аж абамлеў, прыпыніў каня. Заўважыў — яшчэ двое вылазяць. Гэта іх, мабыць, супакоіла—што паслухаўся, стаў. Гэта і памагло яму. Як ён раптам — адкуль узялося! — здагадаўся, так спрытна і лоўка аперазаў пугай па вачах таго, першага! І як тузануў каня, і як конь ірвануў, і як здагадаўся ўпасці на воз! Тры разы бахнулі — не папалі! Жыць яму, значыцца, доўга выпала! Добра і што дарога хутка зазярчула, схавала яго: памагла! Але ж як блізка была нябожчыца старая, каб трохі — той свет пабачыў бы.

Багата што напамінала дарога Апейку. Напамінала, як ветраным кастрычніцкім днём ехаў у Гомель, на курсы: як вяртаўся з курсаў летам ужо з жаданым, сумленна зароблеым дакументам пра тое, што ён — настаўнік: як ездзіў у валасны цэнтр на партыйныя ды настаўніцкія нарады. Думкі тут кожны раз вялі сваёй сцежкай: то ў дзядзькаву хату, дзе ён адзін «вёў» чатыры класы, — у цёмнае лясное сяло; то ў другое такое ж сяло, дзе ён зноў быў у сельсавеце; то к таму ці другому знаёмаму той пары...

Успаміны пра даўняе бралі Апейку найчасцей, калі ён ехаў к роднай хаце. Калі ж вяртаўся, яго больш апаноўвала тое, што давялося пабачыць у сваёй хаце, у сяле. Было амаль заўсёды тужліва і неспакойна: шкада было бацьку і матку, якія станавіліся ўжо зусім старымі. Матка яшчэ завіхалася, калі ён прыязджаў, бы і не чула стомы, а ў бацькі ўсё валілася з рук. Рука дрыжэла, калі трымаў лыжку. Слабеў стары не гадамі, а тыднямі. Да трывогі пра бацьку нязменна прыплываліся супярэчлівыя, блытаныя, з жалем і злосцю, думкі пра брата, пра Саўлюка. Тое ясна, шчырае, што калісьці жыло між іх, цяпер не толькі не лагодніла абодвух, а рабіла яшчэ больш нецярплівымі, непрымірымі. Былі не тое, што чужыя, а горш за чужых: Апейка проста ненавідзеў брата; а брат ненавідзеў яго. Нянавісць гэту ён і вёз з сабой, вяртаючыся: кляў дурную братаву прагнасць, здую зацятасць, што калечыла, паганіла чалавека, шкадаваў матку, якая разрывалася між абодвух...

Бяда з братам вельмі трызожыла Апейкава жыццё. Мала пра што думаў ён цяпер з такой тугою, з такой нярадасцю: як-ніяк той, хто лез у дрыгву, быў брат!..

З тымі трыма дарогамі, якія столькі разоў беглі насустрач Апейку, якія ён асабліва ведаў, была яшчэ адна, таксама важная, але не падобная ні на адну з трох. Яна пачыналася

5

каля рачнога маяка на пясчаным беразе Прыпяці і вяла ў «акругу», у гарбаты, то па-сяброўску ветлівы, то дзелавіта строгі Мазыр. Працавіты, белы «Чыгэрыч», мерна лапочучы па вадзе, штодня лез насуперак шырокай прыпяцкай плыні: з мая, калі сыходзіла разводдзе, да позняй восені з адшукавай ахвотай нёс і на нарады і на суровыя справаздачы. Зімой, па аснежанай рацэ, была самая роўная і самая зручная санная дарога: сані дабягалі да акруговага горада весялей і спарней як берагам...

Ад трох галоўных дарог раёна збочвала мноства меншых дарог, дарожак, сцежак. У кожнай дарогі і дарожкі былі свой характар, свой нораў: мала дзе ў свеце было столькі наравістых, ненадзейных дарог, як на гэтай зямлі. Толькі нямногія з іх і нядоўга ціха ішлі сабе полем ці лесам: большасць, ледзь Апейка ад'язджаў са шляху ці з большай дарогі, зразу ўлазіла ці ў мокрыя зараснікі, ці ў балотнае куп'ё.

За балотамі, за зялёнай тванню ды зараснікамі абапал грэблі, таратайка Апейкава праз нейкі час выбіралася на меншую ці большую выспу, і колы ў летнія сонечныя дні мякка сеялі пясок або дробны, як мука, пыл. Выпаўзала, круцілася поле: млеі на сонцы палоскі звычайна беднай збажыны, нікчэмны колас, худзенькія, хваравітыя сцяблінкі, поле ўсё свацілася наскрозь, пясок ды пясок. Ішлі палоскі зацярушанай пылам бульбы, вецер прыносіў цёплы пах грэчкі. За вытаптаным выганам, амаль заўсёды пры балоце, Апейку абступалі хаты—новыя, пасівелыя ўжо ад дажджу ды ветру, скрыўленыя, абамшэлыя ад даўнасці. За шыбамі, за платамі сустракалі цікаўныя вочы: чым далей ад вялікай дарогі, тым больш рэдка бачылі тут чужога чалавека...

У кожным сяле былі ў Апейкі цяпер знаёмыя, прыяцелі: калі не спяшаўся вельмі, нават кіруючыся далей, ён спыняў каня, завітваў у хату. Да выпіўкі ён быў, усе ўжо ведалі, не вялікі ахвотнік: ведалі, што, калі галодны быў, не таіўся, не аднекваўся для прыліку і не грэбаваў беднай якой грыбной ці шчаўевай поліўкай. І ведалі, што любіў юравіцкі госць, як пачастунак, таўковую, цікавую гаворку. Ведалі і частавалі. Чаго, чаго, а гаворак у Апейкавых паездках хапала заўсёды! То нібы пустыя, са смешкамі, то сур'ёзныя, яны Апейку былі і радасцю і абавязкам: хто-хто, а ён ведаў, як далёка пачнуць па хатах не вельмі багатыя навінамі дзядзькі ды цёткі гаворкі гэтыя, як доўга будуць пераказваць,

Сярод кніг

НА СКРЫЖАВАННІ ВЯТРОЎ І ДАРОГ...

Верш «Вышыня» — усяго дзве страфы, восем радкоў. Гэта паэтычная эпітафія. Тут было, паведамляе яна, расстраляна трое народных мсціўцаў, якія перад смерцю не схілілі галоў.

Аб гэтым
сляды
куль
На цэгле параненай сведчаць.

Надзвычай строгія радкі, надзвычай высокага напалу паэзія. Магчыма, каб М. Танк напісаў яшчэ страфу, дадаў нейкую падрабязнасць, — і верш страціў бы нешта вельмі каштоўнае.

Яшчэ верш, дзе спачатку накіданы даволі знаёмы нам беларускі пейзаж: глуха перапляліся каля арматуры разбітага дота палын і медуніца, трышчутнік і мятліца. Колішняе заміраванае поле.

І, прытаіўшыся, сурова
Маўчаць зямлі цяжкія глыбы.
Бо нават песня жаўрукова,
Апаўшы, выклікае выбух.
(«Арабескі»).

Пасля чытання такога верша інакш глядзіш вакол сябе, інакш прыслухоўваешся да навакольных гукаў, да птушыных галасоў. І амаль што праз усю кнігу лірыкі Максіма Танка, выдадзеную сёлета пад назвай «Глыток вады», праходзіць рэха былых падзей. Чуйны паэт шчыра і заўсёдна заклапочаны тым, каб захаваць у слове перажытае, каб не дазваляць памяці супакойвацца. У зямлі, па якой прайшла вайна, яшчэ шмат не знойдзеных плугамі патронных гільзаў з захаванымі ў іх салдацкімі лістамі, адрасаванымі і ў шасцідзесятыя і ў далейшыя гады.

Праўда, паэт просіць былых сяброў не асабліва наракаць на забыццё, бо як жа ўваскрэснула б жыццё.

Каб не пакрыліся лесам зялёным
Плечы курганаў, траншэі, адхоны.
Не зарубцаваліся ранаў сляды
У сэрцах,
на дрэвах,
на люстры вады?
(«Не наракай, дружа...»).

Але пафас яго лірыкі — памяць сэрцаў, якія і самі нярэдка могуць адгукнуцца на песню жаўрука раптоўным болем або трагічным маўчаннем.

Гэтая скіраванасць творчых намаганняў паэта зусім зразумелая. Ён, вядома, не «падганяў» кніжку да 20-годдзя вызвалення Беларусі ад фашысцкай навалы — гэта атрымалася зусім натуральна. На старонках гэтага, вобразна кажучы, лірычнага «глытка вады» гучыць голас жыцця — шматгучнага і шматколернага, разнастайнага і супярэчлівага.

Зайздросная якасць паэзіі М. Танка — уменне перадаць тое, што часам не падуладна іншым родам літаратуры і мастацтва ўвогуле. Яго таленту ўласціва жывое адчуванне лірычнай стыхіі, здольнасць своечасова «ставіць кропку», не гнацца за тым, каб былі выказаны «ўсе» словы. Мусіць, гэтая асаблівасць якраз і надае танкаўскім вершам непаўторнае хараство еднасці формы і зместу.

Калі гартаеш кніжку «Глыток вады», міжволі заўважаеш, як удумліва і далікатна перадае паэт дыялектыку эмацыянальнага стану чалавека, дынаміку яго пачуццяў. Прыслухаемся, напрыклад, якая чароўная музыка цішыні гучыць у наступных радках:

Дыміць туман на полі, на лугах.
Брыдуць па пояс у вадзе рабіны.
І не відаць, куды нырае шлях,
І не пазнаць знаёмае мясціны.

На поўдзень адлятаюць журавы.
Што ж не знайду старой
бацькоўскай хаты?
Мо і яна праз нівы, паплавы
Узнялася разам з выраем
крылатым?

Гэта ўжо не толькі і не столькі пейзаж, колькі развіццё складанага настрою. Тут ёсць і тое, што ўбачыла вока, і тое, што «прапушчана» праз тэмперамент, праз неспакойную думку і трапяткое пачуццё чалавека. Сыноўняя адданасць роднаму краю тут не дэкларуецца М. Танкам, яна працінае літару і дух верша. Нешта па-свойму сарамлівае афарбоўвае радкі «Дыміць туман...» І паўтараеш за паэтам яго роздум уголас як асабісты: «Мо лепш перачакаць, пакуль зара не прыадчыніць дзверы?» Хораша гэта заўважана! Перачакаць — і тады знікне туман, і адкрыецца нанова далягляд, і пакліча ён у дарогу...

Дарога, матыў вандраванняў па розных пуцявінах жыцця таксама ўваходзіць у кніжку «Глыток вады». У адным з такіх «падарожных» вершаў ён прыгадвае народнае павер'е: «Кажуць... на ложку цяжэй паміраць, пад страхою душа доўга мучыцца». Гэта вымаўляецца з добрай іранічнай усмешкай. Ад жартаўлівай думкі да вялікага абагульнення ўзнімаецца лірычны настрой героя гэтага верша:

І таму я заўжды ў падарожжах
сваіх
На начлег пад страху не
прашуся ніколі,
А спыняюся недзе ля дрэў
баравых,
Ля калоссяў у полі.
Каб між сэрцам маім
і караннем бяроз
Было толькі лісцё траў ды верас
мядовы,
Каб між песняй маёй і блакітам
нябёс
Толькі — пошум дубровы.

З самага пачатку літаратурнай дзейнасці М. Танк выступае жыццялюбам, аптымістам-змагаром. Цяпер часам ён бывае больш, чым калі, іранічным, і не хавае тугі, калі ўспамінае, што за плячыма яго пяць дзесяткаў гадоў. З-пад пяра паэта выходзяць вершы «цалкам» пра гэта («Я знаў людзей...», «Весні дождж», «Юбілейнае», «Як усе, верыў некалі я...»). Аднак не знойдзем у яго радкоў, дзе б панавала пачуццё роспачы. Сонечная ўсмешка асвятляе і тыя творы, без якіх, відаць, паэту з цягам часу не абысціся. Ён славіць не простае і трывожнае жыццё, цану якога зведаў:

Нават найменшую праўду
Я здабываў мазалямі,
Сеткай вылоўліваў з тоні,
Плугам выворваў з глебы.

Можа таму мне так сёння
Дорага кожная маласць,
Як на чале кропля поту,
Як на стале крошка хлеба.

Лірыка М. Танка ўводзіць чытача ў духоўны свет сучасніка. Яна вучыць удзячна слухаць матчыны казкі, яна далучае нас да хараства і чысціні першага снегападу, у ёй мы чуем слова пра светлае каханне, з ёй мы нават бачым, як ноч высыпае зоры з мяхоў, а млын «меле гэты ячмень зорны»...

Лепшыя вершы паэта адкрываюць нам нешта значнае ў людскім жыцці і ў самім чалавеку.

«Лепшыя»... Значыць, не ўсе? Так, не ўсе. Кніга М. Танка 1964 года змяшчае і не надта вартыя яго імя вершы-экспромты і вершы-замалёўкі. Часам, што асабліва прыкра, паэт дазваляе сабе задавальняцца банальнымі выразнымі традыцыйных тэм. Асабліва гэта датычыцца вершаў пра каханне, дзе раптам чытача здзіўляе рамансавая «разрадка» нават самых драматычных сюжэтаў. Побач з такімі, я сказаў бы, маленькімі шэдэўрамі так званай любоўнай лірыкі, як «Хай пішуць распуснікі...», «Каля трох крыніц», «На лузе», «Цішыня», у кніжку трапілі і проста практыкаванні на тэму кахання. Наўрад ці ёсць што-небудзь танкаўскае ў вершах «Кожны раз, калі ты...» або «Адказ на пісьмо». У першым з іх герой прызнаецца, што, як пачуе «дотык пярсцёнка» на яе руцэ, «прабягае па жылах да сэрца агонь», бо напамінае той пярсцёнак... «звяно ланцуга, да якога прыкутая ты». Неяк па-старасвецку манерна і знарок «прыгожа» выказаны тут пачуцці. А ў другім вершы ўвогуле мы «чытаем» зусім прыватнае чужое пісьмо, дзе «ён» паведамляе «ёй» аб тым, што «нат пад маркаю паштовай мой ты знойдзеш пацалунак». Павярхоўная жартаўлівасць радкоў «Ты зноў прыйшоў?..» ці «Спакойна вясну сваю...» таксама засмучае, і міжволі думаеш, навошта было паэту выдаваць кніжкай усе экспромты, што выходзяць з-пад яго пяра. Мабыць, хапіла б і таго, што яны некалі ўбачылі свет на старонках перыядычнага друку.

Пераносячы творы з часопіса ў зборнік, кожнаму аўтару варта яшчэ раз узважыць мастацкую вартасць таго або іншага верша. Калі б М. Танк зрабіў гэта, ён, магчыма, узбагаціў бы і такія занадта проста лінейныя вершы, як «Карлавы Вары», «Трубаправод «Дружба», «Дачнікі», «Дом творчасці і адпачынку», бо гэта толькі подступы да вершаў, толькі накіды, якія робяць кнігу менш цэласнай. Аднойчы М. Танк сам заўважыў: паэт ніколі не бывае застрахаваны ад няўдач. Гэта пацвярджаюць і некаторыя вершы з яго кнігі «Глыток вады».

І ўсё ж сапраўдную каштоўнасць кнігі складаюць яе лепшыя вершы, якіх пераважная большасць. Прыгажосць чалавечых парыванняў і ўчынкаў, настрої нашага сучасніка, шчодрая маляўнічасць і шматгалоссе сёняшняга жыцця — вось што складае паветра танкаўскай паэзіі. І калі ў ім раптам з'яўляюцца хмары мінулага, дык гэта ад добрай заклапочанасці паэта: сучасны свет часам набліжаецца да мяжы, за якой цывілізацыю чакае знішчэнне. Апяваючы на ўвесь голас радасці штодзённага працоўнага быцця людзей, мастак-лірык звяртае нашу ўвагу і на шыбы старой камяніцы, якія бачылі болей, чым «дрэвы і помнікі, яны бачылі болей, як вочы людзей, якія заўжды пасля стрэлаў згасалі».

Асцярожна
Выцірайце шыбы,
Каб з ценем дыму
Пажараў вайны
Не сперці і ценям
Вам блізкіх людзей,
Якія апошні раз
Некалі ў гэтыя шыбы глядзелі.

Ёмісты і значны вобраз — старая камяніца. Яна бессмяротная. Ёй пераходзіць ад пакалення да пакалення, ёй жыць у вяках! Жыць і ў вершах, дзе панае мастацкая лірычная напружанасць і бязмежная самааддача паэта. Ці ж выпадкова так ласкава гаворыць М. Танк, чаму абраў ён «гэту мову»: не толькі таму, што «на ёй рэкі, пушчы гаманілі... што з ёю лёгка было стаць чым хочаш — пявучай скрыпкай, жаўруком, паэтам».

Я гэту мову ўзяў сабе таму, што
Зашмат у ёй было гаротных
песень...

Грамадзянская сталасць паэта — вось што вызначае гэтыя вельмі беларускія вершы. Такая паэзія свабодна выказвае самыя запаветныя думкі і пачуцці чалавека.

Барыс БУР'ЯН.

Максім Танк. «Глыток вады». Вершы. Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1964.

САМУІЛ ЯКАЎЛЕВІЧ МАРШАК

Памёр Маршак... Вострым болем і горам увойдзе гэтая вестка ў мільёны сэрцаў чытачоў усіх узростаў, і старых і малых, і ў нас у Савецкай краіне, і далёка за яе рубяжамі. Савецкая літаратура, наша сацыялістычная і перадавая паэзія панеслі беззваротную страту.

Шматгранны быў талент Самуіла Якаўлевіча Маршака, невычэрпная яго творчая энергія, глыбокія і шырокія яго веды, вялікая і паўсюдная сапраўдны ўсенародная слава паэта.

Адзін з буйнейшых майстроў і пачынальнікаў савецкай літаратуры, паплечнік Горкага і нязменны настаўнік маладых літаратараў, С. Я. Маршак прайшоў вялікі жыццёвы шлях. То быў шлях самаадданага служэння літаратуры, мастацтву, шлях няспынных працы, якая гераічна перасільвала цяжкую хваробу, што мучыла паэта.

С. Я. Маршак нарадзіўся ў 1887 годзе ў Варонежы, у сям'і майстра-хіміка. Дзяцінства і першыя школьныя гады ён правёў у маленькім гарадку Астрагожску Варонежскай губерні. Яшчэ хлопчыкам ён пачаў пісаць вершы, якія друкаваліся ў дарэвалюцыйных перыядычных выданнях. Але літаратурны лёс і творчы шлях Маршака вызначылі дзве сустрэчы: з вядомым крытыкам Ул. В. Стасавым у 1902 годзе і з вялікім пралетарскім пісьменнікам А. М. Горкім праз два гады. Пры падтрымцы Ул. В. Стасава юны паэт паступіў вучыцца ў пецярбургскую гімназію і далучыўся да кола вядомых дзеячоў рускага мастацтва і літаратуры. А. М. Горкі прыняў непасрэдны ўдзел у лёсе таленавітага юнака. У 1904—1905 гг. малады паэт жыў у сям'і Горкага ў Ялце, вучыўся, атрымліваў ад яго непасрэдна творчыя парады і настаўленні. Далейшае знаёмства А. М. Горкага і С. Я. Маршака перайшло пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў трывалае шматгадовае сяброўства і паклала пачатак сумеснай рабоце па развіццю савецкай літаратуры, у прыватнасці па згуртаванню і выхаванню маладых сіл савецкай літаратуры для дзяцей.

Яшчэ ў самыя першыя гады Савецкай улады, жывучы ў Краснадары, а потым у Петраградзе, С. Я. Маршак з уласцівай яму энергіяй уключыўся ў будаўніцтва новай сацыялістычнай культуры. Ён актыўна працаваў ва ўстановах народнай асветы, у першых дзяржаўных тэатрах для юных гледачоў, а потым уклаў нямала душэўных сіл, ведаў, таленту і ўласцівага яму творчага тэмпераменту ў работу па стварэнню і рэдагаванню дзіцячых часопісаў і кніг для дзяцей у Лендзяржвыдавецтве. Гэтая работа Маршака пакінула вялікі і дабратворны след ва ўсёй нашай літаратуры для падрастаючага чытача.

У залаты фонд паэзіі для дзяцей назаўсёды ўвайшлі славутыя вершы С. Я. Маршака, яго вясёлыя і мудрыя жыццялюбныя кніжкі, такія, як «Багаж», «Цырк», «Пошта», «Вось які рассеяны», «Майстар-ламайстар», «Пажар», «Казка пра дурное мышаня», «Містэр Твістэр», «Вясёлае падарожжа ад А да Я» і многія іншыя, якія сталі вернымі сябрамі дзяцінства для некалькіх пакаленняў савецкага народа.

Свет дзіцячай паэзіі Маршака, якая ўслаўляе чалавечую працу, адвагу, любоў і павагу да людзей, сыноўнюю любоў да маці-прыроды, шырока інтэрнацыянальны. С. Маршак хацеў, каб усё народнае, усё сапраўды чалавечае, у якой бы краіне яно ні ўзнікла, заняло трывалае месца ў свядомасці і дзяцей, і дарослых чытачоў нашай Радзімы. Найтанчэйшыя па думцы і паэтычнай мудрасці санеты Шэкспіра, беспадобная паэзія Бернса, англійская і шатландская народная балада, вершы Байрана і Шэлі, Кітса і Кіплінга, Гейнэ і Петэфі дзякуючы Маршаку сталі здабыткам рускай паэзіі. Іх усе чыталі, усе запомнілі, таксама як перакладзеныя Маршаком вершы Лесі Украінкі, Джамбула, Мусы Джаліля, Назыма Хікмета, П. Тычыны, Саламеі Нерыс, Л. Квітко, А. Туманяна і многіх іншых паэтаў.

С. Я. Маршак быў бязлітасным сатырыкам, голас якога асабліва выразна і магутна загучаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, калі паэт пастаянна выступаў на старонках цэнтральнага друку, пісаў тэксты да баявых плакатаў і лістовак, «Вокнаў ТАСС». Ён працаваў у тую цяжкую пару нястомна. Дастаткова сказаць, напрыклад, што толькі за адзін 1941 год на старонках цэнтральнага і армейскага друку было надрукавана 113 баявых, яркіх, патрыятычных вершаў С. Я. Маршака, якія білі ворага.

Глыбокай паэтычнасці і найтанчэйшай пранікнёнасці дасягнуў

С. Я. Маршак у сваіх лірычных вершах. Яго «Лірычныя сшыткі» — плён творчай сталасці паэта, позняе жніво яго вялікага літаратурнага і жыццёвага вопыту.

Пяру С. Я. Маршака належаць многія крытычныя артыкулы аб нашай літаратуры і яе майстрах. І ў гэтай рабоце Маршак заставаўся няўхільна патрабавальны, шчодры і чулы да дзеячоў савецкага мастацтва. Ён быў верны прынцыпам сацыялістычнага рэалізму, паслядоўна і стойка змагаўся за ідэі Камуністычнай партыі. Ён з энтузіязмам аддаваў свае сілы грамадскай дзейнасці.

С. Я. Маршак заслужана заваяваў любоў мільёнаў чытачоў і высокае грамадскае прызнанне. За кнігу «Выбранай лірыкі» і вершы для дзяцей ён быў удастоены Ленінскай прэміі. Чатыры разы яму прысуджалася Дзяржаўная прэмія. Кнігі Маршака выдадзены ў нас агульным тыражом у 70 з лішнім мільёнаў экземпляраў.

За выдатныя заслугі ў развіцці літаратуры паэт быў узнагароджан двума ордэнамі Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны I ступені і медалямі.

Паэмы, вершы, п'есы, пераклады, артыкулы С. Я. Маршака трывала ўвайшлі і назаўсёды застануцца ў скарбніцы савецкай і сусветнай літаратуры. І заўсёды будзе жыць у нашай удзячнай памяці светлы вобраз вялікага паэта, нашага цудоўнага і любімага сябра, аднаго з самых выдатных пісьменнікаў сучаснасці.

Праўленне Саюза пісьменнікаў СССР, праўленне Саюза пісьменнікаў РСФСР, праўленне Маскоўскага аддзялення Саюза пісьменнікаў РСФСР.

МАСКВА. САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ СССР

ГЛЫБОКА ЗАСМУЧАНЫ СМЕРЦЮ ВЫДАТНАГА САВЕЦКАГА ПІСЬМЕННІКА, ГРАМАДСКАГА ДЗЕЯЧА САМУІЛА ЯКАЎЛЕВІЧА МАРШАКА, ВЫКАЗВАЕМ ШЧЫРАЕ СПАЧУВАННЕ СВАЯКАМ, БЛІЗКІМ, СЯБРАМ НЯБОЖЧЫКА.

Саюз пісьменнікаў БССР.

ЯМУ АПЛАДЗІРУЮЦЬ СЯБРЫ

хто разумна скарыстоўвае кожную хвіліну, часу хапае на ўсё.

Вялікая зала заводскага Палаца культуры запоўнена. Ідзе канцэрт мастацкай самадзейнасці. Сваё майстэрства паказваюць людзі, якія ўсяго некалькі гадзін таму назад варылі сталь, стаялі каля станкоў, кіравалі брыгадамі, дапытліва ўгляделіся ў чарцяжы, збіралі сіласаўборачныя камбайны.

— Выступае мадэльшчык ліцейнага цэха шэрага чыгуну Іван Балюк. Руская народная песня «Карабейнікі», — паведаміў вядучы. І адразу грымнулі апладысменты. Гэта і не дзіва. Спевака ведае кожны. З першага дня работы на заводзе ўдзельнічае ён у мастацкай самадзейнасці, свой вольны ад працы час аддае народнаму мастацтву.

— Песні я люблю з дзяцінства, — расказвае Іван Балюк. — Але асабліва пасябраваў з імі на фронце, у час Вялікай Айчыннай вайны.

У ліцейным цэху Івана Балюка любяць і паважаюць. Не толькі за песні, якія ён шчодра дорыць ліцейшчыкам, але і за працу, за ўменне рабіць з дрэва выдатныя мадэлі. Не адзін дзесятак тысяч дэталей адліты па іх. Мала хто з мадэльшчыкаў можа зраўняцца з ім у майстэрстве. Адным словам, майстар — «залатыя рукі». На «Гомсельмашы» Іван Балюк працуе каля 14 гадоў. За гэты час ён выдаў на ліцейны пляц звыш дзвюх тысяч мадэлей. Многа гэта ці мала? Столькі за год можа зрабіць брыгада мадэльшчыкаў чалавек з дваццаці. У цэху ў Івана Балюка спраў шмат. Ён — профгрупорг мадэльнага ўчастка, брыгадзір брыгады мадэльшчыкаў. Можа ўзнікнуць пытанне: а калі ж ён спраўляецца з усімі гэтымі справамі? Дзень, напэўна, малы для такога чалавека? Але дзень бывае малы звычайна для тых, хто не ўмее размяркоўваць час. А таму, хто разумна скарыстоўвае кожную хвіліну, часу хапае на ўсё.

Што гэта іменна так, яскрава відаць на прыкладзе жыцця Івана Балюка. Ён і рабочы, і артыст. Дзе толькі не даводзілася яму выступаць! У рабочых і сельскіх клубах, на палявых станах, каля піянерскага кастра, у цэхах і перад мікрафонам радыё, у цудоўных залах палацаў культуры і на сціплых летніх эстрадах. І заўсёды яго песні прыносяць людзям радасць.

Лёгка гэта даецца спеваку? Не, не лёгка! У кожную песню, якую ён дорыць аўдыторыі, укладзена цяжкая праца.

Дванаццаць грамат, адзін дыплом другой ступені атрымаў Іван Балюк за сваё выканаўчае майстэрства. Да іх яшчэ трэба дадаць восем грамат за плённую працу ў цэху, за варштатам мадэльшчыка.

В. СЯМЁНАЎ.

На сцэне Беларускай дзяржаўнай філармоніі выступіў лаўрэат Усесаюзнага агляду мастацкай самадзейнасці прафсаюзаў СССР, народны харэаграфічны ансамбль «Школьныя гады» Дома культуры аўтамабілістаў Масквы. Мастацкі кіраўнік і пастаноўшчык танцаў, заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР У. Канстанцінаўскі, музычны кіраўнік і дырыжор — студэнт М. Калінін. У гэтым ансамблі прымаюць удзел школьнікі з 1-га па 10-ты класы. Сабраныя ад канцэрта грошы госці ўнеслі ў фонд будаўніцтва помніка абаронцам Брэсцкай крэпасці. Самадзейныя артысты паказваюць таксама свае майстэрства ў піянерскіх лагерах, у Палацы культуры прафсаюзаў, на Мінскім аўтамабільным заводзе.

На здымку: «Нямецкі танец» у выкананні ансамбля.

Фота Ул. КРУКА.

6

услухоўвацца, дашуквацца не толькі яўнага, а і тайнага сэнсу. Гаворкі ціхавыя і карысныя былі і самому Апейку: тут, у гэтых людзей, было мора навін, такіх патрэбных яго душы, якая хацела быць заўсёды з народам...

Калі ён ехаў далей, побач часцяком ішло некалькі дзядзькоў, цётак, чародка цікаўных малых, — праводзілі. За крайнімі хатамі таратайка зноў каціласяпясчанымі калянінамі, разам з якімі і ўбягала ў яшчэ адно балота. Мяняліся зноў абапал зараснікі шызаватых лазнякоў ды бліскучага алешніку, зноў ядавіта зелянела раска, цёпла, дурнотна пахла тванню. Трашчала галлё пад коламі, што дробна дрыжэлі, курыўся пыл — руды, тарфяны.

Адразу збоку грэбелькі млела дрыгва, зманліва зялёная, з буйной травою — ступі і не выберашся, зацягне, зассе навек. Доўга ішлі то купы зараснікаў, то высокая, дурная трава, то раска з жабамі, то чорнае, асклізлае ламачча. Балота, зялёная пагібель, як зглядзець воку, на цэлыя кіламетры, да сіняй пасачкі якога кучаравага лесу.

Час ад часу балота змяняў лес, таксама мокры, з балотнай травою, з асклізлым ламаччам. У ім яшчэ вастрэй біў у вочы смурод гнілі, яшчэ назольней лезла ў вочы, у вушы камарэча, што кідалася цэлымі хмарамі. Балота, мокры лес, зноў балота; выспачкі, нават пясчаныя, былі рэдка, сыходзілі вельмі скора.

Іншы раз таратайка за хатамі ўлазіла ў дрымотны хвойнічак. За хвойнічкам каляіны хутка цямнелі, рабіліся чорнымі, вільготнымі. І лес абступаў ужо не санлівы, хвойны, а пануры, чорны, з такімі зараснікамі, што сонца не магло прабіць, з такой густой навіссю ўгары, што не было відаць неба. Станавілася сярод белага дня цёмна, як увечары. Дарога была ўжо нібы не дарога, а пяшчэра. Колькі ні бачыў такіх дарог, а чуў Апейка, як нешта сціскаецца і чарнее і ў яго душы, як бярэ нейкая маркота, нейкая трывога. Калі ехаў з ім выканкомаўскі возчык Ігнат, Апейка заўважаў, што і ў таго прападае звычайная дарожная санлівасць, у вачах паўляецца неспакойны бляск. Азіраецца мімавоўні.

Мала дзе даводзілася бачыць Апейку такія агромністыя алешыны, бярозы, асіны, часам дубы, што ціснулі бедную дарогу, прымушалі яе віляць і туды, і сюды. То там, то тут каляіны прападалі ў лужынах, і вада ў іх была таксама чорная, як дзёгаць. І гадзіну, і другую ішлі, навісалі, ціснулі з абодвух бакоў магутныя камлі, галіны, здавалася, ніколі не будзе ўжо ні поля, ні сонца; але нарэшце на-

7

перадзе між дрэваў выбліскваў нешта вясёлае, а неўзабаве сляпіў вочы вольны прастор, радаснае неба, воблакі.

2

У ва ўсім раёне не было цяпер сяла ці нават хутарка, у які хоць бы некалькі разоў не наведваўся Апейка. Багата гадзін шыбаўся ён на скураным сядзенні выканкомаўскай таратайкі або ў выканкомаўскіх санях, побач з санлівым і маўклівым Ігнатам ці адзін. У самых закінутых, за лясамі, за балотамі, сёлах было багата ганкаў, на якія ён ступаў, як на свой у мястэчку, багата дзвярэй, падыходзячы да якіх, ён загадзя ведаў, дзе трэба прыгнуцца, а дзе можна і не прыгінацца. Акрамя ганкаў і дзвярэй было нямала ў блізкіх і далёкіх сёлах канап ды ўслонаў, якія Апейка ведаў, як свой ложак, або з якімі пазнаёміўся хоць бы раз.

Яшчэ ў першыя паездкі свае па раёну Апейка заўважыў, што людзі ў розных месцах жылі неадналькава, што тыя, хто жыў падалей ад ракі, між балот ды лясоў, багата чым розніліся ад яго, знаёмых змалку землякоў — жыхароў пясчанай надпрыпяцкай вёсачкі. Розніліся некаторымі звычаямі, розніліся гаворкаю: раптам прыкмеціў, што ў блізкіх, можна сказаць, суседніх сёлах па-рознаму вымаўлялі адны і тыя ж словы, быццам газарылі на розных мовах! Дзіўна было чуць, як дзядзькі ці хлопцы аднаго сяла пацяшаліцца над гаворкаю тых, што жылі за тым жа балотам, з другога боку яго! Пацяшаліся, хоць у саміх гаворка была дзіўная, хоць тыя, з другога боку, таксама падсмейваліся над імі! Апейка, дабіраючыся да разгадкі такога дзіва, меркаваў, што гэта была, мабыць, памяць далёкай даўніны, калі вёсачкі на сваіх выспах між багнішч жылі яшчэ больш разарвана.

Дзе-нідзе сярод палешукоў трапляліся палякі і яўрэі. Палякі, прыкмеціў Апейка, трымаліся купкамі, каля мястэчка, у засценку; яўрэі ж, акрамя тых, што аселі ў мястэчку, жылі па адным, па два ледзь не ў кожным большым сяле, блізка ад дарогі. Палякі корпаліся ў зямлі. Яўрэі таксама нярэдка аралі і малацілі, але большасць кармілася розным рамяством — найчасцей кавальствам ды шытвом. Там-сям спрабавалі гандляваць. Любілі зямлю гэтую і цыганы: нядзіва было бачыць Апейку ці калёсы-буданы на грэблях, ці шумлівыя табары на выганах. Не раз самога якая-небудзь прычэплівая, смуглявая маладзіца хапала на дарозе за руку, дабівалася расказаць, што чакае яго...

І палякі, і яўрэі, і цыганы былі тут сваімі людзьмі. Палякі часта радніліся з тутэйшымі, яўрэі мірна курылі на прызбах разам з палешукамі, амаль у кожным сяле знаходзілася хата, якая давала цыганам цяпло і прытулак на ўсю доўгую зіму. Яны былі ўсе — і цыганы, і палякі, і яўрэі, як ручаінкі, што ўліваліся ў вялікую раку, што самі станавіліся той жа ракою.

Апейка вычытаў у адной краязнаўчай кніжцы, што раён яго — «даволі аднародны». Ён чытаў кніжку ўжо тады, як нямала прыгледзеўся да раёна, і ў словах пра «аднароднасць» пачуў быццам іронію. Яму здалося, нічога не было больш далёкім ад ісціны, як гэта — «аднароднасць»! Ужо тое, дзе жылі, у якім месцы, розніла нямала людзей. Яго землякі, што ўмелі смаліць лодкі і закідваць у прыпяцкія затокі сеці, не ва ўсім былі падобны на тых сваіх братоў, хаты якіх ляпіліся ўздоўж шляху, якія з вясны да зімы толькі і корпаліся на сваіх перадзеленых, перамераных палосках. Людзі па шляху таксама бывалыя, звыклыя да блізкіх і далёкіх гасцей. Нядзіва тут сустрэць граматнага чалавека, амаль у кожным вялікім сяле школы, настаўніні. Але ўсё ж гэтыя не такія ўжо гадзістыя, не такія вольныя на людзях. Гэтым лодка ды сець як дзіва якое, гэтыя не вераць у раптоўную ўдачу, калі за адзін дзень пабагацець можна. Мабыць, таму і гандлююць так ціха, асцярожна, паважна, і далей за Юрэвіцкі кірмаш выбіраюцца рэдка. Рачныя ж — рухавыя, і ў Нароўлі сустрэць лёгка, і ў Мазыры, і за Мазыром. Лёгка набываюць і лёгка трацяць.

Зямля каля рэчкі найбольш пясчаная, няўдзячная. Тых жа, што каля шляху, яна падманвае рэдка, ёй больш вераць, больш старацца. Тут зямля спрадвечных аратых, векавечных плугатараў...

У тых, што за гушчарамі, за балотамі, багата ў чым і свае, асабліва жыццё, і свае характары. За балотамі зямля найбольш паганая, людзі хапаюцца за лес, шукаюць ратунку ў лесе. З ягадамі, арэхамі, грыбамі запасяць на зіму жалуды: цэлымі гарамі ссыпаюць у засекі. Жалуды любяць свінні, жалуды таўкуць на муку: хлеб там рэдка без жалудовай дамешкі. Бывае і толькі з жалудовай мукі: ён у горле, як гліна, у жываце — бы цэгла. За балотамі настаўнікаў менш, менш школ, з-за балот людзі рэдка выбіраюцца ў свет. Там нядзіва сустрэць цётку ці хлопца, які век не бачыў ні паравоза, ні парахода.

9

Там больш за ўсё цёмных, хворых на ліхаманку і сухоты, там самыя недаверлівыя, дзікаватыя позіркі...

«Даволі аднародны...» Той, хто пісаў кніжку, цікавіўся этнаграфіяй, ён казаў пра этнаграфічны склад жыхароў раёна. Яго не цікавіла — ён «меў права» абысці — галоўнае, што вызначала стан людзей у грамадстве — стан іх гаспадаркі; галоўнае, што кідалася найперш у вочы былому сялянскаму хлопцу і цяперашняму старшыні райвыканкома. Не толькі па абавязку, а і з як бы ўжо сардэчнай патрэбы раней за ўсё ўведзвла Апейкава цікавасць, якая ў чалавека гаспадарка: колькі зямлі-пахаці, лугу, лесу (быў яшчэ нямала ў каго і «свой» лес); колькі едакоў у сям'і, колькі працаздольных; колькі коней ці быкоў — якое цягло; колькі кароў, авечак, свіней. Не абыякавая, не фармальная, чалавечая цікаўнасць яго старалася дазнацца не толькі тое, колькі зямлі і лугу, але і якіх: і хто тыя едакі ў сям'і, што не робяць: і які той конь, тая карова — якая карысць з іх. Усякія ж зямля і коні бываюць, — ведаў ён не з падручнікаў якіх, а таму, што папахадзіў па гэтых усякіх землях і паездзіў, папарабіў на ўсякіх конях. І яшчэ не забываў ніколі: ці не служыць хто з хлопцаў у Чырвонай Арміі, дзе, кім, — не забываў не толькі таму, што ведаў, як багата значыў той хлопец у гаспадарцы, а і таму, што помніў, паважаў армейскую службу: хацеў, каб усе помнілі: армія — то армія, хлопец не на гулях, а на дзяржаўнай службе, служыць народу. Значыцца, пашана і яму, і яго бацькам ды братам. Пашана і ўвага...

Бачыў Апейка, што і заможныя і беднякі не ўсе былі на адзін капыл. Былі сярод заможных багацеі — кулакі, п'яўкі, што адно і жылі з чужой крыві, з чужога поту, а былі і такія заможнікі, дзе дастатак увесь набываўся тым, што сям'я ўся — з падрослых, працавітых дзяўчат ды хлопцаў, якімі правіць суровы, бязлітасны камандзір-бацька. Бацька — манарх, бацька — катаржнік; камандзір катаржнай каманды. Былі і такія заможнікі, у якіх адно лічылася зямлі больш як у іншых; але як зямля тая жаўцела жоўценькім пясочкам, то заможнікі такія нагадвалі праўдзіва голых каралёў. Былі і такія, у якіх за чорнымі, пакрыўленымі сценамі, за сляпымі акенцамі, заткнутымі анучамі, таіліся багацці і хцівасць, пра якія б век не падумаў, — поўная кулацкая дзяржава пад абдзёртай, старэчай страхою! А другога гатовы былі залічыць у кулакі толькі таму, што ў таго хата відная на ўсё сяло; выпнуўся, паставіў усім на зайздрасць, лезе ўсім

10

у вочы сваім хорамам; а ў тым хораме век галодныя дзеці — багацце ўсё!

Не блізнятамі былі, бачыў Апейка, і тыя, каго аб'ядноўвалі адным імем — бедната. За тым агульным, добра знаёмым абліччам галечы і нішчымніцы, якое яднала ўсіх, Апейка бачыў розласць лёсаў і прычын: бедныя — ад беднасці зямлі, — што ты выціснеш з таго пясочку ці балота; ад недахвату цягла: паспрабуй, разгарніся без каня; ад таго, што хворыя кармільцы; ад таго, што няшчасці — невядома за які грэх! — сыплюцца; ад таго, што ратоў малых поўна ў хаце: усё — дай ды дай, а падмогі — ніякай! Былі бедныя, што век у працы, у клопаце, і бедныя — што чухаліся і то з лянотаю; былі век цвярозыя і век п'яныя. Былі такія, што Апейка загадзя мог бы паручыцца — у калгасе апорай будзе: калгасная гаспадарка на такіх трымацца будзе; а былі і такія — Апейка гэта таксама добра бачыў, — што не парадуецца калгас, прыдбаўшы: труцень, прыхлябацель, беднасцю сваёй пахваляцца будзе — як білетам на бясплатную паездку ў рай...

Тысячамі самых розных, блытаных, іншы раз — здавалася б — нечаканых вузлоў вязала нястомнае жыццё чалавечыя дачыненні. Стракаты, нястрымна барвісты ішоў перад Апейкавымі вачыма свет, свет не застылых, просценькіх, чорна-белых істот, якіх для зручнасці, для «наглядначасці», нібы ўжо з абавязку, няпісаных, але цвёрдых і высокіх меркаванняў малявалі і ў папулярных брашурах і ў газетах, — а свет складаных, неахвочых да схем людзей, поўных розных, часам супярэчлівых якасцей, імкненняў, пачуццяў; жывых людзей.

Гэта магло падабацца ці не падабацца, але з гэтым Апейку не можна было не лічыцца. Жыццё ўвесь час паказвала сваю складанасць, увесь час ставіла загадкі, якія яму трэба было развязваць. Ён не ўмеў — і не мог — жыць сярод выдуманых істот: яму трэба было рабіць, адказваць жывым людзям, папраўляць іх, кіраваць імі. І трэба сказаць, ён і не наракаў: з такім багаццем цікава было жыць! Што ні чалавек — свой ключык; у кожнага — сцежка свая, свая доля. Жывучы з такімі, разумееш, як ты патрэбны ім, патрэбны справе; разумееш, што не дарэмна хлеб ясі працоўны!

ДА ХУТКАЙ СУСТРЭЧЫ НА КІНАЭКРАНАХ

У КАНЦЫ ЛІПЕНЯ Ў МІНСКУ АДБУДЗЕЦЦА ФЕСТЫВАЛЬ ПОЛЬСКІХ ФІЛЬМАЎ

У Савецкім Саюзе праходзіць фестываль польскіх фільмаў, прысвечаны дваццацігоддзю Польскай Народнай Рэспублікі. Масква, Кіеў, Ленінград, Ерэван, Тбілісі, Мінск і Новасібірск — такі маршрут гэтага свята кінамастацтва братняга польскага народа.

У рэпертуар фестывалю ўваходзяць польскія мастацкія фільмы: «Канец нашага свету», «Пасажырка», «Жонка для аўстралійца», «Як быць каханай», «Дзе генерал?», «Дзяўчына з банка», а таксама дакументальныя і мультыплікацыйныя стужкі.

Нельга без хвалявання глядзець кінакарціну «Канец нашага свету». У ёй з надзвычайнай сілай паказаны крывавы тэрор фашысцкіх катаў, сурова і праўдзіва адлюстравана трагедыя нявінных людзей, зняволеных страшнага фашысцкага лагера смерці — Асвенціма. У фільме раскрыта мужная барацьба вязняў супраць катаў, інтэрнацыянальная салідарнасць людзей розных краін, кінутых гестапаўцамі за калючы дрот. Са страшнай сілай праўды дзейнічаюць на гледача ўведзеныя ў тканіну мастацкага твора сапраўдныя фотаздымкі. Больш за дваццаць гадоў назад гэтыя здымкі былі перададзены невядомым героем-фатографам з-за калючага дроту лагера, і тады ўвесь свет даведаўся аб страшнай праўдзе ў Асвенціме.

Карціна «Канец нашага свету» створана па аднайменнаму раману польскага пісьменніка Тадэвуша Галуя, які сам быў вязнем Асвенціма. Дарэчы сказаць, у гэтым фільме Тадэвуш Галуй іграе ролю аднаго са зняволеных, члена камітэта падпольнай арганізацыі Супраціўлення. Сааўтарам Галуя ў стварэнні сцэнарыя гэтай страшнай антыфашысцкай кінаэпапеі была рэжысёр фільма Ванда Якубоўская, якая таксама шмат перажыла ў гэтым канцэнтрацыйным лагеры. «Канец нашага свету» — сапраўдны кінапомнік героям-антыфашыстам Асвенціма.

З тэмай гэтай карціны пераклікаецца фільм «Пасажырка», пастаўлены па аповесці польскай пісьменніцы Зоф'і Посмыш.

Дзеянне ў фільме разгортваецца ў цяперашнім і мінулым часе.

...На борт акіянскага цеплахода па трапу падымаецца прывабная жанчына, полька Марта. У гэтую хвіліну на яе з верхняй палубы глядзіць другая пасажырка, багата апранутая бялявая дама, якая толькі што бесклапотна размаўляла з мужам. Убачыўшы Марту, яна ад жаху нямее. Гэта — былая наглядчыца з Асвенціма Анна-Ліза Франц. Яна пазнае Марту, цудам выратаваную ахвяру страшнага лагера смерці. Такі пачатак фільма. Гэта — хвалюючая кінааповесць аб злачынстве і помсце, аб перамозе моцных духам людзей, у якіх нават у гестапаўскіх засценках чалавечая годнасць і сумленне не былі зломлены.

Сцэны на акіянскім лайнеры рэжысёр фільма часам паказвае спыненымі фатаграфіямі. У спалучэнні з рухомымі кінематаграфічнымі сцэнамі фашысцкага лагера гэтыя стоп-кадры набываюць асабліва глыбокі сэнс.

Рэжысёр «Пасажыркі» Анджэй Мунк трагічна загінуў у аўтамабільнай катастрофе. Ён паспеў зняць толькі асвенцімскія эпізоды, а сцэны на караблі былі зроблены толькі ў пробных здымках. Сябры Мунка беражна сабралі ўвесь кінаматэрыял і, не даздымаючы ніводнага кадра, зманціравалі фільм. Атрымалася кінакарціна, фактычна не завершаная, але на дзіва моцная па сваёй унутранай ідэйнай і мастацкай паўнаце.

Гвалт губіць каханне — такая асноўная думка фільма «Як быць каханай». Гэта псіхалагічная драма, пастаўленая рэжысёрам Войцэхам Хасам па сцэнарыі Казімежа Брандыса. У карціне пераплятаюцца два сюжэты, два часы. З Варшавы ў Парыж ляціць самалётам вядомая радыёактрыса Феліца — гераіня карціны. Яна ўспамінае сваё вялікае каханне да таварыша па сцэне Віктара Ровіча. Падзеі гэтыя адбываліся ў дні фашысцкай няволі. Фільм расказвае пра жанчыну, якая для выратавання каханага ў гады акупацыі ахвяравала сваім гонарам. Урэшце гвалт і насілле загубілі нават палымянае каханне. На фестывалі ў Сан-Францыска фільм «Як быць каханай» атрымаў вышэйшую ўзнагароду — прэмію Гран-Пры за сцэнарый і акцёрскую работу Т. Крафтуўны, якая выконвае ролю гераіні.

«Жонка для аўстралійца» — музычны агляд з удзелам польскага ансамбля «Мазоўшэ», «Дзе генерал?»— вясёлая кінакамедыя.

У ліку дакументальных фільмаў, якія савецкія гледачы, у тым ліку мінчане, убачаць у дні фестывалю,— «Польская сюіта», «Музыканты», «Генерал Вальтэр», «У коле цішыні», «Нараджэнне карабля», «Тэрыкон». Гэтыя кінастужкі, а таксама мультыплікацыйныя фільмы будуць дэманстравацца перад мастацкімі фільмамі.

У Савецкі Саюз на свята польскага кінамастацтва прыбылі госці з Варшавы. Сярод іх польскія акцёры: Тэрэза Віцінска, Эльжбета Чыжэўска, Эва Гжыжэўска, Люцына Вінніцка, Веслаў Голас, Лех Скалімоўскі, рэжысёры Станіслаў Барэя і Тадэвуш Хмялеўскі.

Мы гутарылі з маладой польскай кінаактрысай Тэрэзай Віцінскай, чыё фота са словамі прывітання да нашых гледачоў публікуецца ў газеце.

— Я даўно марыла пабываць у Савецкім Саюзе і вельмі шчаслівая, што маё жаданне збылося, — сказала яна. — Масква, Ленінград, Кіеў, Мінск, Новасібірск — колькі новых для нас гарадоў, колькі цікавых сустрэч! Аб Савецкай Беларусі, аб горадзе Мінску я ведаю не толькі па вядомых савецкіх фільмах, але і па расказах маіх сяброў, якія пабывалі ў гэтых цудоўных краях. Вельмі рады, што ў дні фестывалю пакажам беларускім гледачам нашы лепшыя кінастужкі.

Мы просім актрысу расказаць аб рабоце над роллю Марыйкі ў фільме «Канец нашага свету».

— Я не сядзела за калючым дротам Асвенціма, — гаворыць Тэрэза Віцінска. — Але калі на мяне надзелі сапраўдны паласаты гарнітур вязня лагера, калі пачаліся першыя здымкі ў крывавых фашысцкіх засценках (гэта было ноччу), дык стала страшна ад усёй жахлівай абстаноўкі лагера смерці.

Тэрэза расказала пра адну цікавую сустрэчу. Фільм «Канец нашага свету» першымі паглядзелі былыя вязні Асвенціма, якія сабраліся ў Кракаве. У час кінасеанса ў зале не раз чуўся плач. Пасля сеанса да Тэрэзы Віцінскай падышла сівая жанчына, моцна паціснула руку актрысе і сказала:

— Дзякуй! Вы праўдзіва сыгралі мяне. Я — Тэрэза Віцінска.

Так актрыса сустрэлася з былой зняволенай лагера, якая насіла яе імя і прозвішча. Аказалася, што глядачка прыбыла за калючы дрот з першым транспартам, які фашысты прыгналі ў Асвенцім з Царнопаля. Тэрэза Віцінска ў лагеры насіла нагрудны знак — № 1.

Другі польскі госць — кінарэжысёр Станіслаў Барэя ў гутарцы з намі сказаў:

— З вялікай цікавасцю мы чакаем сустрэчы з патрабавальнымі мінскімі кінагледачамі. Мы рады паказаць працоўным Савецкай Беларусі дасягненні нашага кінамастацтва напярэдадні слаўнага свята — дваццацігоддзя Народнай Польшчы.

Тэрэза ВІЦІНСКА.

Станіслаў Барэя гаворыць, што за гэтыя гады ў Польшчы выпушчана 186 мастацкіх і чатыры тысячы караткаметражных фільмаў. У краіне ёсць дзевяць студый. Звыш 200 польскіх фільмаў атрымалі 300 прызаў, прэмій і дыпломаў на міжнародных кінафестывалях.

Першым пасляваенным поўнаметражным мастацкім фільмам, знятым у Польшчы, былі «Забароненыя песенькі». Герой гэтай карціны — песенька вуліц Варшавы акупацыйных год. Патрыятычная, баявая, задзёрыстая і насмешлівая, гэта песенька была нібы дапаможнай зброяй у барацьбе з фашысцкімі захопнікамі.

Першы польскі дакументальны фільм «Майданек» быў зняты польскім рэжысёрам Басекам з удзелам і дапамогаю савецкіх ваенных кінематаграфістаў. З таго часу мацнее дружба работнікаў кіно Польшчы і Савецкага Саюза. Плёнам гэтай дружбы з'явіўся і нядаўна зняты фільм «Ленін у Польшчы». Цяпер закончана работа над другім сумесным фільмам «Спынены палёт», дзе ў ролі савецкага лётчыка здымаўся акцёр маскоўскага тэатра сатыры Бляяўскі.

Заканчваючы гутарку, Станіслаў Барэя прасіў перадаць праз газету «Літаратура і мастацтва» сардэчнае прывітанне беларускім кінагледачам, што мы ахвотна і робім.

Да хуткай сустрэчы на экранах і ў кіназалах Мінска! — гаворым мы майстрам польскага кіно.

А. ІВАНОВА, А. ВАСІЛЬЕВІЧ.

ВІЦЕБСК—ХРУДЗІМ

У невялічкім пакойчыку бібліятэкі Віцебскай трыкатажнай фабрыкі «КІМ» на стале замацаваны тры сцяжкі — беларускі, рускі і чэхаславацкі. Каля іх ляжыць альбом. Гісторыя сцяжкоў і альбома не зусім звычайная. Некалькі год назад на фабрыцы было створана аддзяленне Таварыства савецка-чэхаславацкай дружбы. Яно наладзіла сувязь з трыкатажным прадпрыемствам «Эліта» чэхаславацкага горада Хрудзім. З таго часу фабрыкі абменьваюцца мастацкай і тэхнічнай літаратурай, альбомамі, плакатамі. Работнікі фабрычнай бібліятэкі паслалі ў бібліятэку чэхаславацкага прадпрыемства альбом рэпрадукцый экспанатаў Дзяржаўнага Рускага музея. У адказ з Хрудзіма прыйшла пасылка кніг мастацкай і тэхнічнай літаратуры. А гэтымі днямі бібліятэка атрымала бандэроль. У ёй аказаліся паштоўкі з рэпрадукцыямі славутых мастацкіх палотнаў Дрэздэнскай галерэі.

І. СЯМЁНАЎ.

КУПАЛАЎСКІ ВЕЧАР

У Мінскім Палацы прафсаюзаў адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 82-й гадавіне з дня нараджэння Янкі Купалы. Пра неўміручасць народнага паэта Беларусі гаварылі рабочая моладзь, настаўнікі, студэнты.

Аб дзяцінстве свайго брата расказала малодшая сястра Купалы — Леакадзія Раманоўская. Мастацкі кіраўнік Беларускай акадэмічнай харавой капэлы народны артыст СССР Р. Шырма гаварыў аб рэвалюцыйным значэнні купалаўскай паэзіі. З успамінамі аб сустрэчах з песняром выступілі кампазітары Я. Цікоцкі і Д. Лукас. Вершы, прысвечаныя Купалу, прачыталі М. Аўрамчык і Я. Крупенька. Верш украінскага паэта П. Гарэцкага аб Купалу і гераічным беларускім народзе-змагары прачытала на ўкраінскай мове навуковая супрацоўніца музея Т. Тарасава.

Пасля вечара былі паказаны дакументальныя фільмы аб жыцці і творчасці Янкі Купалы і дзейнасці Акадэмічнага тэатра яго імя.

А. ВЕРАС.

З НАШАЙ ПОШТЫ

ДАРОГА Ў МЕСЦЫ АДПАЧЫНКУ

Вакол Мінска нямала маляўнічых месц, зон адпачынку. У перадвыхадныя і выхадныя дні многія мінчане выязджаюць у лес, на азёры. Але як выбрацца за горад?

Чамусьці амаль усе аўтобусы адпраўляюцца ў месцы адпачынку з вакзала? Ці правільна гэта? Жыхарам розных раёнаў даводзіцца ж спачатку траціць час, каб дабрацца да вакзала, а ўжо там «штурмам» браць сабе месца.

Вось маршрут № 26—Мінск — Гарадзішча. Аўтобус з першай жа станцыі ідзе перапоўнены. Як правіла, на гарадскіх прыпынках ён ужо не спыняецца. Людзі стаяць гадзінамі, нервуюцца, настрой адпачынку знікае. А можна ж змяніць парадак руху аўтобусаў і без цяжкасцей перавозіць пасажыраў. Для гэтага трэба толькі першапачатковы прыпынак перанесці з вакзала да абсерваторыі (канчатковы прыпынак тралейбуса № 1). Тады разгрузіцца асноўная магістраль горада і павялічыцца амаль у два разы абарачальнасць машын. Можна зняць нават з гэтага рэйсу кандуктараў, а адкрыць касу і прадаваць білеты па колькасці пасажыраў, якую можна адправіць у адзін рэйс. Патрэбен толькі дзяжурны, які б кіраваў пасадкай.

Слова за кіраўнікамі Мінскага аўтобуснага парка. Дарогу ў месца адпачынку трэба зрабіць часткай самога адпачынку.

К. КІТАЕВІЧ.

ВЯЛІКАЕ МАСТАЦТВА МАЛЕНЬКІХ АКЦЁРАЎ

У Савецкім Саюзе — Маскве і Ленінградзе — праходзілі пасяджэнні прэзідыума Міжнароднага Саюза дзеячоў тэатра лялек — «УНІМА». У дні работы прэзідыума ў Ленінградзе адбылася Усесаюзная канферэнцыя на тэму «Тэатр лялек у жыцці дзіцяці».

Агенцтва друку Навіны прапануе чытачам артыкул тэатразнаўцы Юрыя Оснаса аб развіцці лялечнага тэатра ў Савецкім Саюзе.

«Мы таксама пакажам сапраўднае жыццё, але яно ў відовішча надзвычайнейшае тэатрам ператорана», — пісаў Маякоўскі пра адну са сваіх п'ес. Гэтыя словы цалкам могуць быць аднесены да лялечнага тэатра: неадухоўленыя лялькі, якія іграюць жывых людзей, — якое сапраўды надзвычайнае відовішча! І разам з тым гэта відовішча, у якім раскрываецца «сапраўднае жыццё», сапраўдныя чалавечыя характары, адносіны, пачуцці...

Мастацтва лялечнікаў — адно са старажытнейшых у свеце. У даўнія, незапамятныя часы нарадзіліся героі лялечнага тэатра. У індыйцаў гэта быў Відушака, у рымлян Макус, у англічан Панч, у французаў Палішынель, у рускіх Пятрушка. Як ні адрозніваліся гэтыя героі сваім абліччам, яны заўсёды былі плоцю ад плоці народа, аптымістамі, свабодалюбцамі, злымі і праніклівымі насмешнікамі. Нездарма выступленні Пульчынелы, сябра карбанарыяў, былі забаронены ў фашысцкай Італіі. Любімы народам лялечны тэатр сустракаў нядобразычлівае стаўленне з боку ўладаносцаў. Акцёрамі былі напаўубогія бадзягі, якія выступалі на вуліцах, дварах, у кірмашовых балаганах.

У царскай Расіі, як і цяпер у большасці краін, не было ніводнага лялечнага тэатра, які меў бы пастаяннае «жыллё».

Савецкі тэатр успрыняў усё дэмакратычнае, па-мастацку яркае, што было ў старадаўнім мастацтве лялечнікаў. Але, па сутнасці, ён не адрадзіў гэтае мастацтва, а, выкарыстоўваючы яго традыцыі, стварыў зусім новую і надзвычай папулярную форму сцэнічнага відовішча. Прыняты на ўтрыманне дзяржавы, лялечны тэатр стаў неад'емнай часткай усёй савецкай мастацкай культуры.

Калі ў 1933 годзе ў госці да Максіма Горкага прыехалі акцёры-лялечнікі, вялікі пісьменнік сказаў, што лялечны тэатр гэта — «патрэбная і вялікая справа», ён павінен уключыць у сваю арбіту не толькі дзіцячага, але і дарослага гледача, не толькі горада, але і вёскі, і прыцягнуць да сваёй дзейнасці «лепшых майстроў слова і жывапісу».

Мы з поўнай падставай можам адзначыць, што запаветы Горкага ажыццёўлены. У СССР цяпер каля 90 дзяржаўных лялечных тэатраў. Яны штогод выпускаюць каля 400 прэм'ер і даюць прыблізна 50 тысяч спектакляў. Апроч гэтых тэатраў, існуюць калектывы лялечнікаў, якія падпарадкуюцца розным арганізацыям і ўстановам — прафсаюзам, мясцовым аддзелам народнай асветы, эстрадна-канцэртным арганізацыям. Калі да гэтага дадаць дзесяткі тысяч пастановак самадзейных лялечных тэатраў, мастацкіх калектываў пры дамах культуры, клубах, школьных гурткоў, — колькасць гледачоў нашага лялечнага тэатра складзе мільёны.

Важна адзначыць, што за апошнія гады заснавана спецыяльнае аддзяленне па падрыхтоўцы дзеячоў лялечнага тэатра пры Ленінградскім інстытуце тэатральнага мастацтва і рад навучальных студый пры буйнейшых тэатрах лялек.

Драматургію лялечнага тэатра, з пункту гледжання яе «адрасата», можна падзяліць на тры катэгорыі: прызначаную для дзяцей; для дзяцей і для дарослых; толькі для дарослых.

Надзвычай разнастайныя драматычныя жанры. Тут і камічныя оперы, і сатырычныя агляды, і сур'ёзныя п'есы, і камедыі ўсіх відаў. Але асабліва вялікае месца займае казка. Тэатру лялек блізкая яе народнасць, яе простыя і высакародныя ідэі: чалавекалюбнасць, справядлівасць, таварыскасць, патрыятызм. У аснове казачных спектакляў савецкага лялечнага тэатра ляжаць шматлікія творы рускага і сусветнага фальклору, цудоўныя творы Пушкіна, Аксакава, Андэрсена, братоў Грым, Перо. Невычэрпнай крыніцай з'яўляюцца аповесці Гогаля, апавяданні Чэхава, «Гулівер» Свіфта, «Прыгоды Тома Сойера» Твэна.

Наш тэатр лялек, як і ўсё савецкае сцэнічнае мастацтва, бачыць адну з важнейшых сваіх задач у адлюстраванні сучаснай рэчаіснасці. Новы касмічны век знайшоў увасабленне ў радзе пастановак, якія часта паўжартоўныя, поўныя фантастыкі, але ў той жа час праўдзіва перадаюць сутнасць вялікіх навуковых подзвігаў і іх неаглядныя перспектывы. Такія — «Жар-птушка ляціць на Марс», «Бураціна на Месяцы», «Дзед-Мароз у космасе».

Асаблівая ўвага і стараннасць праяўляюцца пры выбары рэпертуару для юнага пакалення. «Мы імкнёмся да таго, — пісаў Сяргей Абразцоў, — каб у спектаклях для маленькіх дзяцей быў вельмі просты, лёгка ўспрымаемы сюжэт, без усялякіх жахаў, страхаў і забойстваў або збіванняў, каб у ім было шмат забаўнага і смешнага, але каб смех у глядзельнай зале быў добры, вясёлы, а не зларадны і не здзеклівы».

Савецкі лялечны тэатр выпрацаваў асобны і цэласны творчы метад. Нашы лялечнікі адмаўляюць методыку вонкавага імітавання лялькай рухаў чалавека, якое ператварае мастацтва ў трук, скасоўвае вобраз і характар. Але яны адмаўляюць і абстрактна-сімвалічнае разуменне лялечнага тэатра. Лялечныя вобразы яны разглядаюць як адлюстраванне ў спецыфічных формах жывой, рэальнай рэчаіснасці. Лялька не можа перадаць складанасць і шматграннасць чалавечай псіхалогіі. Але затое яна часам не горш, чым жывы акцёр, можа перадаць характэрныя рысы людзей у іх найбольш абагуленым праяўленні, стварыць чалавечы тып.

Вельмі вялікай вышыні дасягнула тэхнічная дасканаласць нашага лялечнага тэатра. Мала хто з гледачоў здагадаецца, напрыклад, што калі Пацюк у «Начы перад калядамі» есць галушкі, за сцэнаю ў гэты час дзейнічаюць пяць акцёраў, дакладна ўзгадняючы свае найдрабнейшыя рухі. Або што герой-спартсмен са спектакля «2:0 у нашу карысць» мае 12 лялек-дублёраў, якія непрыкметна падмяняюць «галоўнага выканаўцу» ў час тых або іншых фізкультурных практыкаванняў.

Савецкі лялечны тэатр заваяваў міжнароднае прызнанне. Адно з апошніх сведчанняў — нядаўнія трыумфальныя гастролі ў ЗША Сяргея Абразцова і яго Цэнтральнага Маскоўскага тэатра лялек.

Дзейнасць лялечнага тэатра ў СССР і яго рэпертуар прасякнуты духам інтэрнацыяналізму. Напрыклад, на афішы Дагестанскага тэатра лялек па суседству з айчыннай п'есай «Нур Эдзін» значацца чэшская «Златаўласка» і італьянская «Чыпаліна». У Ташкенце вы можаце бачыць, скажам, у аўторак узбекскую п'есу «Туці і Кунры», а ў сераду—украінскую «Лясны гадзіннік», у чацвер — рускую «Аленькую кветачку». Нядаўна выдадзены ў Маскве зборнік «Тэатр лялек зарубежных краін» уключае п'есы, перакладзеныя з дзесятка моў. Маскоўскі тэатр лялек з поспехам інсцэніраваў і паставіў навелу аргенцінскага пісьменніка Альварэса Юнга «Понча».

Маленькія акцёры савецкага тэатра лялек робяць вялікую і высакародную справу.

Юрый ОСНАС,
тэатразнаўца.
(АДН).

З кінакамерай па рэспубліцы

«САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» № 16

Кіначасопіс адкрываецца сюжэтам, прысвечаным знаходжанню Старшыні Савета Міністраў СССР М. С. Хрушчова ў Аб'яднанай Арабскай Рэспубліцы.

Далей расказваецца аб новым апараце для хуткага і якаснага вызначэння кіслотнасці і шчолачнасці прамысловых раствораў, створаным на Гомельскім заводзе вымяральных прыбораў, аб слаўных справах дзяўчат з калгаса імя Ільіча Магілёўскага раёна Галі Казловай, Тамары Лубачкінай і Клавы Куксаравай, якія пасля заканчэння школы засталіся працаваць у роднай вёсцы.

Асобны кінасюжэт прысвечаны мітынгу ў Кіеве з выпадку 150-годдзя з дня нараджэння вялікага ўкраінскага кабзара Тараса Шаўчэнкі, у якім прынялі ўдзел і беларускія пісьменнікі.

У Маскве атрымала пастаянную прапіску гасцініца «Мінск». Сюжэт расказвае, з якой удзячнасцю пакідаюць госці атэль, што носіць імя сталіцы Беларусі.

У заключэнне гледачы пабываюць на традыцыйным свяце вясны ў Брэсце.

ПАМЯТНЫЯ МЯСЦІНЫ БЕЛАРУСІ

ТУТ НАРАДЗІЎСЯ МАНЮШКА

На левым беразе ракі Волмы, якая зарасла чаротам і лазняком, за ячменным полем, на невысокім пагорку ўзвышаецца старая таполя, пад якой бушуе бэз і дзе-ні-дзе туляцца да арэшніку кусты здзічэлых руж. Даволі правільны квадрат забытага саду — адкуль ён тут? Навакол няма жылля, толькі лес, луг і поле. Сярод кустоў віднеюцца рэшткі фундаментаў, нейкія чатырохвугольныя ямы, пагоркі.

Цішыня... Толькі шуміць старая таполя — апошняя сведка падзей, што адбываліся на гэтым месцы каля ста пяцідзесяці год назад.

Калісьці сад быў абсаджаны радамі таполяў (яшчэ віднеюцца заімшэлыя вялізныя пні), засталася толькі адна, апошняя. Пройдзе яшчэ некалькі год — і няўмольны час знішчыць і яе. Але людзі не павінны забыць гэтае месца, дзе стаяў дом, у якім у маі 1819 года нарадзіўся славуты польскі кампазітар Станіслаў Манюшка.

Ва ўсіх энцыклапедыях і даведніках пра Манюшку напісана, што ён нарадзіўся ў фальварку Убель «паблізу ад Мінска», або «недалёка ад Мінска». Але ні на адной карце Мінскай вобласці нельга знайсці такі геаграфічны пункт. Музыказнаўцы толькі паціскаюць плячыма: сядзіба не захавалася, месца забылася. Мне параілі заглянуць у «Слоўнік геаграфічных назваў», выдадзены ў Варшаве ў 1892 годзе. Гартаю гэтае выданне і, нарэшце, знаходжу: «Убель. На рацэ Волма. Сем вёрст ад Смілавіч, семнаццаць вёрст ад мястэчка Ігумен» (цяперашні Чэрвень).

Аўтобус імчыць па Магілёўскай шашы, заварочвае ў Смілавічы. Я выходжу на цэнтральнай плошчы, распытваю моладзь. Нічога не ведаюць. І толькі нейкая сівая жанчына сказала:

— Ідзі на Камейкі, а там спытаеш. Здаецца, ёсць такая вёсачка.

Даспявае жыта, высока пад воблакамі звіняць жаўрукі, спяваючы сваю адвечную песню. Недзе зусім блізка родавае гняздо Манюшкаў. Можа маленькі Стась хадзіў па гэтай дарозе, слухаючы нябесных песняроў і, вярнуўшыся дадому, наігрываў на старэнькім матчыным фартэпіяна падслухаю ў прыроды мелодыю?..

Дзіцячыя, самыя моцныя і незабыўныя ўражанні будучага кампазітара звязаны з беларускай песеннасцю. Ён рос сярод беларускіх сялян, слухаў іх песні, і яны пазней ажывалі ў ягоных творах.

Маці Станіслава Манюшкі — Эльжбета Маджарская-Манюшка даволі добра іграла на раялі. Яна была першай музычнай настаўніцай свайго сына. Калі Стасю споўнілася адзінаццаць год, сям'я пераехала ў Мінск. Манюшка паступае ў гімназію, бярэ ўрокі ў мінскага піяніста і дырыжора Дамініка Стэфановіча.

У Мінску пастаўлены (і часткова напісаны) оперы «Сялянка» «Вясковая ідылія») і «Рэкруцкі набор» — абедзве на лібрэта беларускага драматурга В. Дуніна-Марцінкевіча. Пастаўлены прыватным мінскім тэатрам Шмітгофа і два другія сцэнічныя творы Манюшкі — «Латарэя» і «Барацьба музыкаў». Кампазітар апрацоўвае беларускія і польскія народныя песні, піша творы на словы А. Міцкевіча, шэраг інструментальных п'ес.

Славуты аўтар «Галькі», якая абышла лепшыя тэатры свету, нарадзіўся як кампазітар на беларускай зямлі. На нашай звонкай зямлі, сярод пявучых сялян, якія жылі і жывуць над гэтай ціхай рачулкай.

За вёскай Камейкі — вялізны лес, напоены водарам хвоі і даспелых суніц. За лесам рыбгас «Волма», прыгожыя сажалкі з астраўкамі чаротаў, за сажалкамі — маленькая вёска Убель. Але Манюшка нарадзіўся не тут. Сівы дзед паказаў мне добра бачны арыенцір: за рэчкай віднеецца магутная таполя, якая стаіць адзінока сярод поля. Дзед расказвае мне аб старым фальварку. Я іду туды, на спатканне з мінулым...

Каля ракі, насупраць манюшкаўскага саду, ураслі ў зямлю вялікія гранітныя валуны, а каля іх уецца шыпшына і цвітуць лугавыя кветкі. Справа — могілкі, сярод якіх я знайшоў мармуровую пліту з датамі «1813 — 1903 г.». Польскія літары пасярэдзіне збіты, прозвішча неразборліва. Віднеецца раскрыты склеп з старадаўняй цаглянай кладкай.

Я зноў і зноў вяртаюся ў манюшкаўскі сад, прадзіраючыся праз зараслі бэзу і крушыны. Незадоўга перад вайной дом яшчэ стаяў. Але фашысцкая навала прынесла поўнае знішчэнне старажытнаму фальварку.

Гэтае месца, прыгожае і ціхае, не павінна быць забыта. Заснавальнік польскай класічнай оперы Станіслаў Манюшка любіў Беларусь, апяваў яе ў сваіх творах. Гэтае месца павінна быць неяк адзначана, каб не згубілася сцежка да родных мясцін славутага кампазітара.

М. АЛТУХОЎ.

Манюшкаўская таполя.

ДА 150-годдзя З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ВЯЛІКАГА РУСКАГА ПАЭТА МІХАІЛА ЮР'ЕВІЧА ЛЕРМАНТАВА

15 кастрычніка 1964 года спаўняецца 150 год з дня нараджэння вялікага рускага паэта Міхаіла Юр'евіча Лермантава, творчасць якога, прасякнутая глыбокім гуманізмам, заклікам да свабоды і шчасця, адыграла вялікую ролю ў развіцці рускай і сусветнай літаратуры. Гэты юбілей адзначаецца па рашэнню Сусветнага Савета Міру. Савет Міністраў СССР арганізаваў Усесаюзны юбілейны камітэт. Ён прыступіў да работы. Аб тым, як будзе адзначацца 150-годдзе з дня нараджэння Лермантава ў Савецкім Саюзе, карэспандэнту АДН расказвае старшыня камітэта пісьменнік Мікалай Грыбачоў.

Творчасць Лермантава шырока вядома ў Савецкім Саюзе. Нягледзячы на тое, што паміж ім і нашым сучаснікам ляжаць многія дзесяткі гадоў, паэта любяць і чытаюць і сёння.

Лермантаў заваяваў любоў чытачоў усіх пакаленняў не выпадкова: ён народны паэт і свае сілы чэрпаў у рэвалюцыйных настроях рускага народа, а свае мастацкія вобразы — у рускай рэчаіснасці.

ВЕЧНА ЖЫЦЬ ПАЭТЫЧНАЙ ПРАЎДЗЕ

Мікалай ГРЫБАЧОЎ, савецкі пісьменнік, старшыня Усесаюзнага юбілейнага камітэта

Дазволю сабе прывесці некаторыя лічбы, якія гавораць аб вялікай папулярнасці паэта. У Савецкім Саюзе кнігі Лермантава вытрымалі 681 выданне агульным тыражом 31 мільён 716 тысяч экземпляраў на 66 мовах свету, у тым ліку на мовах народаў СССР выйшла 287 кніг. Амаль шэсць мільёнаў — тыраж рамана «Герой нашага часу». Ён выдаваўся 156 разоў.

І цяпер да юбілейных дзён нашы выдавецтвы зноў выпускаюць творы вялікага паэта, новыя кнігі і даследаванні, манаграфіі, папулярныя біяграфіі і нарысы пра яго. У Дзяржаўным выдавецтве «Художественная литература» выйдзе новы поўны збор твораў, зборнік «Вершы і паэмы», зборнік «Лермантаў ва ўспамінах сучаснікаў». Новыя матэрыялы, знойдзеныя за апошнія два гады, публікуе ў сваёй кнізе «Лермантаў. Даследаванні і знаходкі» пісьменнік Іраклій Андронікаў.

Рыхтуюцца да юбілею «Советский писатель», «Молодая гвардия», а таксама рэспубліканскія нацыянальныя выдавецтвы.

У юбілейныя дні з 10 па 14 кастрычніка 1964 года ва ўсёй краіне пройдуць урачыстыя вечары, прысвечаныя памяці паэта. У гарадах і вёсках адкрыюцца выстаўкі «Жыццё і творчасць М. Ю. Лермантава».

Спецыяльныя кніжныя выстаўкі рыхтуе Дзяржаўная бібліятэка імя Ул. І. Леніна, бібліятэка замежнай літаратуры, Дзяржаўны літаратурны музей. Пушкінскі дом у Ленінградзе адкрывае выстаўку карцін пра Лермантава і карцін, якія напісаны самім паэтам.

Ва універсітэтах культуры, тэатрах, палацах і клубах выступяць дзеячы мастацтва, літаратуры, члены Дзяржаўнага юбілейнага камітэта.

Акадэмія навук СССР правядзе сесію, на якой савецкія літаратуразнаўцы раскажуць аб вялікай спадчыне М. Ю. Лермантава, аб яго ролі ў развіцці мовы і літаратуры. Міжвузаўская канферэнцыя на гэтую тэму ўжо адбылася на радзіме паэта ў Пензенскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя В. Р. Бялінскага.

У Маскве, Ленінградзе, Пензе і Пяцігорску камітэт сумесна з Саюзам пісьменнікаў СССР арганізуе вечары паэтаў народаў СССР, а ў Пяцігорску, Кабардзе і Дагестане будзе праведзены форум паэтаў Каўказа, края, якому Лермантаў прысвяціў натхнёныя радкі.

Савецкія тэатры ўключаюць у рэпертуар спектаклі, оперы і балеты, напісаныя на лермантаўскія сюжэты і пра М. Ю. Лермантава. На экранах краіны гледачы ўбачаць фільмы «Княжна Мэры», «Маскарад». Цяпер нашы кінематаграфісты працуюць над новым мастацкім фільмам па матывах лермантаўскай «Тамані».

Міністэрства сувязі СССР выпусціць серыю юбілейных паштовак, канвертаў, марак, а Дом гуказапісу— новыя запісы твораў паэта ў выкананні лепшых майстроў.

Усерасійскае тэатральнае таварыства стварыла юбілейную камісію, якая мае намер арганізаваць конкурс чытальнікаў на лепшае выкананне твораў М. Ю. Лермантава. На радзіме паэта, у горадзе Пензе, а таксама і ў іншых гарадах краіны ў дні юбілею будуць праведзены народныя гулянні і фестывалі мастацтва абласных тэатральных і канцэртных арганізацый.

АДН.

Тэлебачанне

10 ліпеня

Першая праграма. 17.35—праграма перадач. 17.40 — тэлевізійныя навіны. 18.00—тэлевізійны эканамічны веснік «На рубяжах сямігодкі» (М). 18.50—кінанарыс. 19.00—на стадыёнах і спартыўных пляцоўках. 20.50—для веруючых і няверуючых. Гутарка члена таварыства «Веды» Е. Чарнамора. 21.15—кінанарыс «Горад сустракае раніцу». 21.30—тэлевізійныя навіны (М). 22.00—канцэрт па заяўках.

Другая праграма. 12.00—«На прасторах Радзімы». Кінарэпартаж (М). 17.25—праграма перадач (М). 17.30—для малодшых школьнікаў. «Надвор'е ў малюнках» (М). 18.00 — «На рубяжах сямігодкі». Тэлевізійны эканамічны веснік (М). 18.50—тэлевізійныя навіны (М). 19.00—на стадыёнах і спартыўных пляцоўках. Футбол «Спартак» (М)—«Шахцёр» (Данецк) (М). 20.50—«Шлях дружбы, шлях стварэння». Перадача, прысвечаная Дню народнай рэвалюцыі ў Манголіі (М). 21.30—тэлевізійныя навіны (М). 22.00—«Спявае Галіна Вішнеўская». У праграме рамансы П. Чайкоўскага. Акампаніруе лаўрэат Ленінскай прэміі М. Растраповіч (М).

11 ліпеня

Першая праграма. 16.05—праграма перадач. 16.10—«Навіны з блакітнага экрана». 17.00—на стадыёнах і спартыўных пляцоўках. Футбол ЦСКА — «Дынама» (Кіеў) (М). 18.45—кінанарыс «Агні Маскоўскага метро». 19.00 — «Свабодны свет, як ён ёсць». Перадача 1-я (М). 19.35—музычны антракт. 19.45—«Двое ў стэпе». Мастацкі фільм. 21.05 — канцэрт заслужанай артысткі УССР Лідзіі Сухарукавай. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00—эстрадны канцэрт Інтэрбачання (М).

Другая праграма. 15.40 — праграма перадач (М). 15.45—для дзяцей. «Вясёлыя расказы» (М). 16.00 — «Юны піянер». Перадача з Кішынёва. 17.00—«Песні кахання». Фільм-канцэрт. 17.30 — «Жыццё спачатку». Мастацкі фільм. 18.50—тэлевізійныя навіны (М). 19.00 — «Будзем знаёмы, я—газ». «Будуем па-новаму». Кінанарысы. 19.35—народны мастак СССР С. Каненкаў. Да 90-годдзя з дня нараджэння (М). 20.05 — «Тры плюс два». Мастацкі фільм.

12 ліпеня

Першая праграма. 11.30 — для школьнікаў. «Аб шахматах і шахматыстах». 12.00—«Востраў скарбаў». Мастацкі фільм. 15.05—праграма перадач. 15.10—кінанарыс «Хто ў цераме жыве?» 15.30—«З імем Леніна». Да 40-годдзя прысваення камсамолу імя Ул. І. Леніна (М). 17.30—кінапанарама (М). 18.30—«Мангашлыцкая руда». Кінанарыс. 19.00—канцэрт ансамбля «Шлёнск». Перадача з Вільнюса. 21.30—тэлевізійныя навіны (М). 22.00—«Асабняк на Зялёнай вуліцы». Мастацкі фільм для дарослых.

Другая праграма. 10.00 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. Н. Гернет. «Гусяня». Спектакль Калінінскага тэатра лялек (М). 10.40 — «Генка Пыжоў—першы жыхар Брацка». Тэлефільм (М). 12.00 — перадача для дзяцей з ГДР. 13.00 — «Куды пайсці вучыцца» (М). 15.00—музычны кіёск (М). 15.30—«У алтайскіх вучоных». Кінанарыс. 16.00 — «З песняй па Волзе». Канцэрт. 16.30—«Дом з мезанінам». Тэлевізійны спектакль. 17.30—«Суровая памяць». Дакументальны фільм. 18.30—«З імем Леніна». Да 40-годдзя прысваення камсамолу імя Ул. І. Леніна. (М). 21.30—тэлевізійныя навіны (М). 22.00—тэатр паэта і чытальніка (М).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3 24 61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25 25, адказнага сакратара — 3-44 04, аддзела літаратуры — 3 21-53, аддзела мастацтва — 3-24 62, аддзела культуры—3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 3 19-52, бухгалтэрыі — 3-11 03

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856 Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 02983.